ЦІ ЗНІЗЯЦЬ ПЛАТУ ЗА ІНТЭРНАТЫ? 4

ЧАМУ ПАГАРШАЕЦЦА ЯКАСЦЬ ВАДЫ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

13 ЛІПЕНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 132 (28748)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА

Не прагулка — трэніроўка!

Юныя веласіпедысты трэніруюцца на вольнай ад руху дарозе паміж вёскамі Адамова і Мікуліна Полацкага раёна.

Фота Анатоля КІПІШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:

«У Беларусі ідзе актыўная работа па паляпшэнні ўмоў вядзення бізнесу. Мытныя органы краіны таксама прымаюць меры, накіраваныя на садзейнічанне развіццю міжнароднага гандлю, у тым ліку электроннага, на спрашчэнне вядзення бізнесу, звязанага са знешнеэканамічнай дзейнасцю, у мэтах забеспячэння самых спрыяльных умоў для развіцця нацыянальнай эканомікі».

КАРАТКА

• Энергетыкі Мінскай вобласці ўчора аператыўна аднавілі электразабеспячэнне ў 123 населеных пунктах рэгіёна. Адключэнне электрычнасці адбылося з-за абрыву праводу на паветранай лініі ў 110 кВ, прычыны высвятляюцца.

• У Мінску разглядаецца пытанне павышэння кошту праезду ў грамадскім транспарце.

• У Пружанскім раёне недалёка ад аграгарадка Хорава ратавальнікі патушылі пажар на полі з азімай пшаніцай, выратавана 88,5 га ўраджаю.

• У рамках экафэсту «Чарнічны Team building — 2018» 14 ліпеня ў Полацкім раёне «Чарнічны марафон» збярэ каля 400 чалавек. За шэсць гадзін удзельнікам трэба будзе сабраць як мага больш ягад і зрабіць «Чарнічныя стоп-кадры».

ISSN 1990 - 763X

■ Разумныя грошы

Гульня ў «блакітныя фішкі». Пачатак

Беларусы пачалі актыўна набываць акцыі высокатэхналагічных кампаній, такіх як Amazon, Google і Facebook

Нашы грамадзяне з грашыма працягваюць актыўна ўкладаць зберажэнні ў замежныя каштоўныя паперы. Часцей за ўсё набываюць гэтыя «фішкі» праз механізм давернага банкаўскага кіравання.

У РОСЦЕ — IT-СЕКТАР

Найбольш папулярныя ў нашых суайчыннікаў сусветныя карпарацыі з IT-сектара, прыйшлі да высновы аналітыкі аднаго з камерцыйных банкаў. У большасці выпадкаў гаворка ідзе аб куплі акцый Apple, Facebook або Alphabet — уладальніка Google. Цікавасць вырасла і да кітайскіх гігантаў, перш за ўсё Alibaba Group, больш вядомай дзякуючы інтэрнэт-пляцоўцы AliExpress. Акрамя таго, нашы багацеі сталі актыўна інвеставаць у Amazon, Netflix і NVIDIA — усплёск цікавасці да іх прыйшоўся на апошні год.

СТАР. 2

■ Сітуацыя

ЗАМУРАВАНЫЯ СРОДКІ І СПАДЗЯВАННІ

Аплачаную маёмасць не аддаюць ва ўласнасць, а прадаюць з аўкцыёну

Юлія марыла пра краму кветак, Ігар хацеў адкрыць піцэрыю, Вольга — наладзіць гандаль оптыкай. Сваю справу яны, як і яшчэ некалькі бізнесменаў, меліся весці ва ўласных павільёнах. Для гэтага і ўклалі сродкі (ад 80 да 300 тысяч долараў) у будаўніцтва шматпавярховага жылога дома з убудаванымі ў яго адміністрацыйнымі памяшканнямі, дзе павінны былі размясціцца іх офісы. Поўнасцю разлічыліся бізнесмены за будучую ўласнасць яшчэ ў 2012-м. Аднак атрымаць яе не могуць дагэтуль. Памяшканні не здадзеныя ў эксплуатацыю, забудоўшчык аб'явіў аб банкруцтве, а антыкрызісны кіраўнік прапануе дольшчыкам набыць ужо аплачаную імі маёмасць праз аўкцыён або заключыць міравое пагадненне і ўкласці яшчэ два мільёны долараў, каб давесці памяшканні і тэрыторыю вакол дома да належнага стану. Ці могуць бізнесмены спадзявацца на вяртанне грошай або ўласнасці, высвятляла карэспандэнт «Звязды».

Было — ваша, стала — забудоўшчыка-банкрута

Футбольны клуб «Сквіч» у 2012 годзе надумаўся стаць забудоўшчыкам і ўзвесці дом. Дольшчыкі адміністрацыйнай часткі будынка заключылі дагаворы з клубам і ў той жа год поўнасцю ўнеслі грошы на будаўніцтва. Дом узводзіўся, мяняліся генеральныя падрадчыкі. Жылую частку здалі 31 снежня 2014 года, хоць планавалася скончыць увесь аб'ект у 2013-м. Другі пускавы комплекс — частку пад адміністрацыйную нерухомасць — не дарабілі і дагэтуль.

СТАР. 4

Гульня ў «блакітныя фішкі». Пачатак

УКЛАДАЮЦЬ НЕ АПОШНЯЕ

На куплю «блакітных фішак» заможныя людзі ў сярэднім трацяць ад 20 да 50 тысяч долараў. Хоць ёсць і тыя, хто інвестуе 100 тысяч долараў і больш. У той жа час на прырост зберажэнняў уплывае не толькі сума ўкладанняў, але і абраная стратэгія. Самы вялікі прыбытак склаў 90 тысяч долараў — столькі зарабіў за мінулы год адзін з кліентаў БПС-Ашчадбанка.

Пры правільнай стратэгіі інвестыцыі ў акцыі дазваляюць прыкметна прымножыць зберажэнні. Большасць кліентаў выбіраюць партфелі з нізкім узроўнем рызыкі, але павялічваецца і колькасць тых, хто рэалізуе ўласныя агрэсіўныя стратэгіі, гуляючы на трэндах, якія растуць.

У тэму

Аналітыкі амерыканскага фінансавага холдынга JP Morgan прааналізавалі пяць апошніх глабальных рэцэсій і прыйшлі да высновы, што ў выпадку наступлення чарговага крызісу ў першую чаргу трэба пазбаўляцца ад валют краін, якія развіваюцца.

Спецыялісты JP Morgan раяць набываць японскія іены, швейцарскія франкі, сінгапурскія долары і долары ЗША (хто б сумняваўся. — **С. К.**). Некалькі дзён таму іншы буйны фінансавы інстытут — Bank of America Corp. — спрагназаваў магчымае паўтарэнне падзей 1998 года, калі расійскі рубель абясцэніўся ў чатыры разы, а фінансавую сістэму Расіі проста паралізавала.

У чэрвені пра рызыкі новай рэцэсіі пасля 2019 года папярэдзваў Сусветны банк. Паводле назіранняў яго аналітыкаў, за апошнія паўстагоддзя глабальныя рэцэсіі адбываюцца практычна кожнае дзесяцігоддзе.

Спалохаліся? Зараз паспрабуем правесці аналіз з нашага боку. Раптам рэцэсія. А грошы нашы ў акцыях замежных кампаній. Як яны там, ці добра ім там?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ФІНАНСАВЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ — ЗАЎСЁДЫ РЫЗЫКА

Ці ўсё так бясхмарна, як абяцаюць нам банкаўскія работнікі? Так, паслугі па даверным кіраванні дазволяць вам у поўнай меры атрымаць выгаду ад інвеставання свабодных грашовых сродкаў у каштоўныя паперы, купіць акцыі замежных кампаній, якія існуюць на вядучых сусветных біржах Нью-Ёрка, Лондана, Франкфурта, Масквы.

Патэнцыйная прыбытковасць такіх аперацый неабмежаваная, а канчатковы фінансавы вынік залежыць ад характару інвестыцыйных рашэнняў. Так, фондавы індэкс S & P500, які адлюстроўвае змяненне кошту акцый каля 500 найбуйнейшых кампаній ЗША, за апошнія пяць гадоў вырас на 87,5 %.

Акцыі асобных кампаній дазволілі інвестарам куды больш істотна павялічыць першапачатковую суму ўкладанняў. Але, калі я пагутарыў з работнікам Беларусбанка, то зразумеў, што яшчэ не гатовы на такія подзвігі. Ён растлумачыў мне, што рызыка няправільна выбраных кампаній ляжыць толькі на мне. А гэта значыць, што пры нейкіх абставінах я не толькі не магу разлічваць на салідны прыбытак, але і рызыкую страціць укладзеныя грошы.

Дылер растлумачыў, што, для таго каб гуляць на рынку акцый, трэба мець не проста нюх на ўдачлівыя кампаніі, але і жалезную вытрымку. А галоўнае, трэба мець свабодныя грошы, якія, калі што, не балюча будзе і страціць.

Хто аказваецца ў выйгрышы, дык гэта банк. Узнагароджанне за свае паслугі банк ацэньвае ў 1 % ад сумы сродкаў пад кіраваннем. У рамках заключанага дагавора давернага кіравання без збірання дадатковай узнагароды банк можа не толькі ўнесці дадатковую суму грашовых сродкаў, але і адклікаць частку грошай (у межах 50 % ад першапачатковай сумы дагавора) і нават скасаваць дагавор, праўда, датэрмінова вярнуўшы грошы ў поўным аб'ёме.

Да таго ж атрыманыя ў ходзе давернага кіравання даходы падлягаюць падаткаабкладанню, пры гэтым банк выступае ў якасці падатковага агента.

НЕ ХАПАЕ СВАІХ ПРАПАНОЎ

Цікавасць да акцый глабальных кампаній расце на фоне зніжэння прыбытковасці ўкладаў. Нябедныя кліенты шукаюць альтэрнатыўныя спосабы ўкладання зберажэнняў і нярэдка становяцца саўладальнікамі замежных кампаній. Механізм рэалізаваны праз давернае кіраванне: банк ад імя кліента выходзіць на фондавы рынак, купляе акцыі і потым кіруе партфелем.

Яшчэ некалькі гадоў таму назад Мінфін краіны прапаноўваў багатым беларусам дзяржаўныя аблігацыі пад 7 % гадавых. Крыху пазней банкі сталі рэалізоўваць уласныя аблігацыі пад 6,5 % гадавых, потым — пад 5 %, 4 %, 3,5 % гадавых. Зараз такія працэнты ўжо ніхто не дае, самае большае — 2,2 %, або 2,5 % гадавых.

Затое на рынку з'явіліся карпаратыўныя аблігацыі. Іх таксама прадаюць банкі, але вось адказнасці за канчатковы выкуп гэтых каштоўных папер назад у насельніцтва фінансавая ўстанова ўжо не нясе. Ну і што? Гэтая агаворка нашых людзей не спыніла. Толькі Беларусбанк за апошні час прадаў карпаратыўныя аблігацыі пад 6-7,5 % на многія мільёны долараў. Эмітэнтам гэтых каштоўных папер былі такія акцыянерныя таварыствы, як «Контэ-Спа», «Чысты бераг», «Універсам Цэнтральны», «Гандлёвы дом «Няміга-Фаварыт», «Белбізнеслізінг» і многія іншыя. Уладальнікі такіх аблігацый задаволеныя, яны атрымліваюць прыстойны прыбытак у валюце.

Але сёння такіх карпаратыўных аблігацый на дакументарным рынку каштоўных папер ужо няма. Іх выкупілі. Вось і застаецца грамадзянам нашай краіны ісці на фондавы рынак і купляць акцыі замежных кампаній.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

МЭЙ: АЛЬЯНС З ЗША ЗАСТАНЕЦЦА НАЙВАЖНЕЙШЫМ ДЛЯ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ ПАСЛЯ BREXIT

Брытанскі прэм'ер адзначыла, што ў Лондана і Вашынгтона ёсць «агульнае глабальнае бачанне ў дачыненні да пераважнай большасці пытанняў знешняй палітыкі».

Таму, адзначыла Тэрэза Мэй, Вялікабрытанія разлічвае яшчэ больш умацаваць супрацоўніцтва ў галінах абароны, бяспекі, а таксама гандлёвыя адносіны са Злучанымі Штатамі, альянс з якімі будзе і пасля Brexit найважнейшым для Злучанага Каралеўства.

«Калі мы пакінем Еўрапейскі саюз, мы пачнём праклада ць новы курс для Вялікабрытаніі ў сусветнай прасторы, і нашы глабальныя альянсы стануць мацнейшыя, чым калі-небудзь. Не існуе больш моцнага саюзу, чым той, які грунтуецца на нашых «асаблівых адносінах» з ЗША, і ў наступныя гады не будзе саюзу больш важнага», — адзначыла Мэй у заяве, распаўсюджанай прэм'ерскай канцылярыяй.

Па словах кіраўніка брытанскага ўрада, «у Злучанага Каралеўства і Злучаных Штатаў ужо склаліся выключна цесныя партнёрскія адносіны ў барацьбе за дэмакратыю і глабальную бяспеку».

ГЕНЕРАЛЬНЫ САКРАТАР НАТА ЗАЯВІЎ, ШТО ГРУЗІЯ Ў БУДУЧЫНІ СТАНЕ ЧЛЕНАМ АЛЬЯНСУ

Саміт НАТА прызнаў імкненне Грузіі ўвайсці ў альянс, гэтая краіна ў будучыні стане яго членам. Як паведамляе ТАСС, пра гэта ўчора заявіў генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг пасля кароткай двухбаковай сустрэчы з прэзідэнтам Грузіі Георгіем Маргвелашвілі на палях саміту. Енс Столтэнберг пры гэтым не ўдакладніў тэрміны ўступлення Грузіі ў НАТА.

Сёлета споўнілася 10 гадоў, калі на саміце арганізацыі ў Бухарэсце кіраўнікі дзяржаў альянсу паабяцалі, што Украіна і Грузія з часам стануць членамі НАТА. Генеральны сакратар НАТА таксама пахваліў Тбілісі за поспехі на шляху рэформаў і заклікаў працягваць ісці тым жа шляхам. Ён выказаў удзячнасць Грузіі, якая на працягу больш чым 10 гадоў выдзяляе адзін з самых вялікіх ваенных кантынгентаў для аперацыі НАТА ў Афганістане.

Прэзідэнт Грузіі Георгій Маргвелашвілі пасля двухбаковай сустрэчы з генеральным сакратаром НАТА заявіў, што НАТА і Грузія разгледзяць на саміце ў Бруселі пашырэнне супрацоўніцтва ў сферы бяспекі ў Чорным моры, у тым ліку правядзенне ў рэгіёне буйных ваенных манеўраў у 2019 годзе.

БАХРЭЙНСКАЯ ПРЫНЦЭСА СТАЛА ПЕРШАЙ ЖАНЧЫНАЙ-ПІЛОТАМ КАРАЛЕЎСКІХ ВПС

Бахрэйнская прынцэса Аіша Бінт Рашыд Аль Халіфа стала першай у гісторыі каралеўства жанчынай, якая села за штурвал ваеннага самалёта, паведамляе ТАСС са спасылкай на газету «Аль-Джарыда».

Вядома, што прынцэса Аіша выканала палёт на вучэбна-трэніровачным самалёце Hawk Mk-129 бахрэйнскіх ВПС з авіябазы імя шэйха Ісы. Палёт доўжыўся адну гадзіну. Аішы было прысвоена званне другога лейтэнанта авіяцыі. У Бахрэйне назвалі гэты палёт гістарычным для каралеўскай авіяцыі.

СУБОТА — ДЗЕНЬ ПРАЦОЎНЫ

У суботу ў аблвыканкамах адбудуцца традыцыйныя прамыя лініі

14 ліпеня з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ, тэл. 80162213121;

намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Віктар Віталевіч АСКЕРКА, тэл. 80212222222;

намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ, тэл. 80232331237;

намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ, тэл. 80152735644;

старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір Віктаравіч ДАМАНЕЎСКІ, тэл. 802225 01869;

старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ, тэл. 80175004160;

намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК, тэл. 80172224444.

■ Эканамікс

ЭКСПАРТНЫ ПАРТФЕЛЬ ДЛЯ КІТАЯ

У Мінсельгасхарчы расказалі пра перспектывы паставак на рынак КНР і не толькі

Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Ігар БРЫЛО паведаміў, што сёлета за пяць месяцаў з пачатку года экспарт мясной прадукцыі вырас на 15 %. За гэты перыяд краіна прадала за мяжу мяса-малочнай прадукцыі на суму каля $1,2 млрд, з якіх каля $800 млн было атрымана за «малочку». Колькасць паставак у КНР павялічылася ў пяць разоў.

Дыверсіфікацыя за кошт Азіі

У 2017 годзе экспарт мяса-малочнай прадукцыі Беларусі склаў $3,1 млрд. Важнай задачай для беларускіх сельгасвытворцаў застаецца дыверсіфікацыя паставак. Гэта азначае зніжэнне долі расійскага рынку ў агульным аб'ёме экспарту прадукцыі жывёлагадоўлі. Па выніках мінулага года доля Расіі ў агульным аб'ёме экспарту малочнай прадукцыі складала 90,3 %, а сёлета за пяць месяцаў яна знізілася да 82,7 %.

«Мы змаглі дасягнуць гэтага за кошт выхаду на рынкі новых краін. Мы выходзім на рынкі Азіі, Амерыкі, Афрыкі, Еўропы. У гэтым кірунку вядзецца вельмі сур'ёзная работа», — растлумачыў Ігар Брыло.

Усяго за пяць месяцаў сёлета краіне ўдалося экспартаваць малочную прадукцыю ў 39 краін, мясную — у 16. Адным з цікавых напрамкаў з'яўляецца Кітай. «У цэлым беларускай мяса-малочнай прадукцыі ў студзені — маі экспартавана на кітайскі рынак на суму каля $10 млн», — паведаміў Ігар Брыло. У КНР адбыліся першыя пастаўкі беларускай ялавічыны. У планах — экспарт мяса птушкі.

Пры гэтым пастаўшчыкі адзначаюць, што кітайскі рынак застаецца досыць складаным напрамкам. На ім неабходна правесці сур'ёзныя маркетынгавыя даследаванні і дамагчыся пазнавальнасці беларускай прадукцыі.

Тэхналогіі як тавар

«Акрамя таго, мы будуем малочнатаварную ферму на Сахаліне. Плануем запусціць яе сёлета. Жывёла ўжо адобрана, цяпер прапрацоўваюцца пытанні яе дастаўкі», — дадаў намеснік міністра.

Ён расказаў, што ў краіне ёсць добрыя прыклады ўкаранення ізраільскіх, чэшскіх, дацкіх тэхналогій у сферы жывёлагадоўлі. «Ізраільскі бок праяўляе цікавасць да будаўніцтва ў Беларусі селекцыйна-генетычнага цэнтра ў галіне свінагадоўлі. Зараз рыхтуецца некалькі цікавых праектаў з КНР у Віцебскай вобласці — гэта датычыцца малочнатаварных фермаў», — рэзюмаваў Ігар Брыло.

Але карміць трэба лепш

Аднак у краіне ёсць і шэраг праблем, якія неабходна вырашыць у найбліжэйшай перспектыве. Перад аграрыямі пастаўленыя амбіцыйныя задачы ў рамках праграмы па развіцці аграрнага бізнесу да 2020 года. Калі па выніках 2017 года выраблена крыху больш за 7 млн тон малака, то да канца праграмы гэты паказчык павінен дасягнуць 9,2 млн тон. Выйсці на такі вынік неабходна за кошт павелічэння прадукцыйнасці і колькасці жывёлы.

«Упершыню летась удалося выйсці па ўдоях на карову на 5 тысяч кг малака. Але гэта не мяжа і неабходна цяпер дайсці да параметра ў 6 тысяч кг. Патэнцыял беларускіх жывёл складае 7 тысяч і вышэй. На асобных прадпрыемствах краіны гэты паказчык дасягае звыш 10 тысяч кг на карову», — адзначае **першы намеснік генеральнага дырэктара НПЦ НАН па жывёлагадоўлі Іван ШАЙКО.**

Спецыяліст дадаў, што малако гарантавана застаецца на высокім узроўні якасці ў межах удояў у 7,5 тысячы кг малака на карову, а ўжо далей — якасць можа губляцца.

Рост якасці і ўдояў магчымы толькі пры захаванні тэхналогій нарыхтоўкі кармоў, што, па словах навукоўца, у нашай краіне адбываецца далёка не заўсёды.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

ПРЫВІТАННЕ, ФЕСТЫВАЛЬ!

Учора, 12 ліпеня, у Віцебску афіцыйна стартаваў XXVII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Падчас традыцыйнай прэс-канферэнцыі, якая прайшла напярэдадні цырымоніі адкрыцця, **Васіль ЖАРКО, намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, старшыня арганізацыйнага камітэта фестывалю,** адзначыў, што мэта свята — аб'ядноўваць і саграваць цяплом усіх удзельнікаў, здзіўляць дасягненнямі беларускай культуры. Член урада падкрэсліў, што ў ім удзельнічаюць прадстаўнікі ўсіх кантынентаў, а аўтарытэт фестывалю на міжнароднай арэне, які расце, сведчыць аб правядзенні паслядоўнай дзяржаўнай палітыкі і прызнанні ўкладу Беларусі ў сусветную культуру.

Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, міністр інфармацыі Беларусі, паведаміў журналістам, што пра фестывальныя падзеі раскажуць больш як 400 прадстаўнікоў каля 130 СМІ. І, што цікава, заяўкі працягваюць паступаць у дырэкцыю. Ён падкрэсліў, што гэта свята мастацтваў з вялікай літары, якое займае годнае месца ў сусветным культурным асяроддзі.

Юрый БОНДАР, міністр культуры, адзначыў, што віцебскі фэст — маштабны форум мастацтваў і па ўзроўні не саступае аналагічным еўрапейскім мерапрыемствам. Штогод ён набірае моц і аўтарытэт. Фестываль насамрэч ператварыў Віцебск у фестывальную сталіцу планеты. За гісторыю яго правядзення тут выступілі каля 100 тысяч артыстаў з 72 краін.

Аляксандр СІДАРЭНКА, кіраўнік дырэкцыі фестывалю, прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі фестываляў, канстатаваў, што ўсе праекты, якія запланавалі правесці падчас фэсту, акупляюцца. І, нягледзячы на тое, што білеты пачынаюць рэалізоўваць зімой, іх вельмі актыўна купляюць за тыдзень да пачатку і ў фестывальныя дні.

Як заўсёды, цырымонія адкрыцця была насычаная жанрамі, у ёй выступілі зорныя артысты, гледачы былі ўражаны мноствам фарбаў светлавога афармлення. Канцэрт прайшоў як на «адным дыханні».

На «Алеі зорак» з'явілася іменная зорка Розы Рымбаевай. Сёлета яна стала ўладальнікам спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення».

Сёння, 13 ліпеня, на фэсце насычаны дзень. У прыватнасці, упершыню выступяць удзельнікі дарослага конкурсу выканаўцаў, адкрываецца фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». Для дзятвы і падлеткаў шмат сюрпрызаў у сталіцы праекта «Лялечны квартал» — «Беларускім тэатры «Лялька». У музеях адкрываюцца выстаўкі, у тэатры з аншлагам выступаюць вядомыя артысты.

Віцебск жыве звыклым для яго фестывальным жыццём, у асаблівым «базарным» тэмпе.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Варкаўт і брэйк-данс у Віцебску

Фестываль маладзёжных субкультур пройдзе ў сталіцы «Славянскага базару»

14 ліпеня на «Славянскім базары» ў Віцебску пройдзе Дзень моладзі «Мой родны кут, як ты мне мілы». Прадстаўнікі маладзёжных аб'яднанняў расказалі, што будзе адрозніваць гэтае свята ад папярэдніх, дзе пройдуць галоўныя дзеянні і калі пачынаецца рэгістрацыя.

Першы сакратар цэнтральнага камітэта БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК пераканаў у тым, што сёлета дакладна будзе на што паглядзець. Мерапрыемства распачне арт-парад «БелаРусь у сэрцы маім!», у якім прымуць удзел прадстаўнікі маладзёжных субкультур і аб'яднанняў (скейтбардысты, брэйк-дансеры, джамперы), танцавальныя калектывы, таленавітая і адораная моладзь з усёй краіны.

Пасля парада распачнецца патрыятычная акцыя «Мы помнім, мы ганарымся!». Удзельнікі мерапрыемства аддадуць даніну памяці савецкім воінам і ўскладуць кветкі да мемарыяльнага комплексу ў гонар воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў Віцебшчыны.

Асаблівая ўвага была ўдзелена фестывалю маладзёжных субкультур і здароваму ладу жыцця. З прэзентацыямі сваіх праектаў выступілі прадстаўнікі аб'яднанняў.

Уладзімір ЯНУШКЕВІЧ, кіраўнік брэйк-данс-каманды Conquistador crew, расказаў, што федэрацыя брэйк-данса была створана толькі год таму і зрабіла вялікі крок наперад. На пляцоўцы «Славянскага базару» будуць праводзіцца майстар-класы ад прызнаных брэйкераў, батлы паміж дзецьмі і дарослымі. Удзел можа прыняць кожны, хто захапляецца гэтым відам спорту, бо ўсё адбудзецца на вольнай пляцоўцы.

Андрэй СЯМАВІН, кіраўнік дабрачыннага некамерцыйнага грамадскага аб'яднання прыхільнікаў аўтагуку, расказаў пра сваю незвычайную субкультуру. Іх мэта ў тым, каб моладзь перастала збірацца ў гаражах і выйшла на вялікую пляцоўку. Кожны, у каго ёсць машына, можа прыехаць на фестываль і прыняць удзел у дзеянні. Кіраўнік пераканаў у тым, што ўсё пройдзе не вельмі гучна, але весела і цікава.

Акрамя фестывалю маладзёжных субкультур, пройдуць фестываль дваровых гульняў «Альтэрнатыва», дзе старэйшае пакаленне навучыць моладзь гульням іх дзяцінства, інтэрактыўная экспазіцыя «Беларусь — крыніца натхнення», падчас якой адбудзецца прэзентацыя беларускіх традыцый, нацыянальных сімвалаў і асаблівасцяў беларускай культуры і бітва дыджэяў «Беларусь і я», дзе беларускія народныя мелодыі загучаць у сучаснай апрацоўцы.

Маргарыта ГАЙДАРЖЫ.

■ Занятасць

Афіцыйнае беспрацоўе зніжаецца

На пачатак ліпеня ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 0,4 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва. У мінулым месяцы гэты паказчык быў 0,5 працэнта.

У Брэсцкай і Віцебскай абласцях беспрацоўе зафіксавана на ўзроўні 0,6 працэнта, у Гродзенскай, Гомельскай і Магілёўскай — 0,5, у Мінскай — 0,4, а ў сталіцы — 0,1. На ўліку стаіць 17,8 тысячы незанятых грамадзян. У базе вакансій змяшчаецца 75,2 тысячы прапаноў ад наймальнікаў. Гэта амаль на 40 працэнтаў больш, чым было год таму. Каля 64 працэнтаў свабодных працоўных месцаў — па рабочых прафесіях. Каэфіцыент напружанасці на рынку складае 0,2 беспрацоўнага на вакансію.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

Чэмпіёны супраць дэбютантаў

Падышоў кульмінацыйны момант чэмпіянату свету па футболе

Першым фіналістам мундзіялю стала зборная Францыі, якая ў матчы за права згуляць у вырашальнай сустрэчы абыграла каманду Бельгіі 1:0. Французы ўжо з'яўляюцца двухразовымі чэмпіёнамі Еўропы (1984 і 2000 гады) і чэмпіёнамі свету 1998 года. Усяго ж яны ўдзельнічалі ў фінальных стадыях топтурніра 14 разоў. Зборная Францыі стала першай камандай у гісторыі, якой удалося пасля перамогі на сусветным першынстве аказацца найлепшай таксама і ў Еўропе.

Апошні раз у фінале чэмпіянату свету французы гулялі ў 2006-м, тады камандай кіраваў Раймон Даменек. У вырашальным матчы дасведчаная дружына саступіла па пенальці Італіі. Менавіта пасля гэтага чэмпіянату са зборнай развітаўся лідар і капітан каманды Зінедзін Зідан.

На рахунку «трохкаляровых» таксама значыцца перамога на Алімпійскіх гульнях у Лос-Анджэлесе-1984 і два Кубкі канфэдэрацый. Медалі якой вартасці дададуць сабе ў актыў французы ў 2018-м, даведаемся ў нядзелю.

Іх сапернікамі сталі харваты, якія ў паўфінале выбілі з барацьбы за «золата» тытулаваных англічан (2:1). Для балканскай зборнай цяперашні чэмпіянат свету ўжо стаў найлепшым у гісторыі, такога выніку футбалісты гэтай краіны не дамагаліся ніколі. Хоць пэўныя поспехі ў маладой каманды (яна існуе з 1990 года і была прызнана ФІФА і УЕФА толькі ў 1992-м) ужо былі. У 1998 годзе зборная Харватыі стала бронзавым прызёрам чэмпіянату свету, а яе гулец Давар Шукер — найлепшым бамбардзірам турніру. Зборная Харватыі двойчы (у 1994 і 1998 гадах) прызнавалася ФІФА камандай, якая дамаглася найбольшага прагрэсу ў рэйтынгу зборных па выніках года, а таксама займала ў ім месцы з 125-га па 3-е, што складае найбольшую розніцу паміж занятымі месцамі ў рэйтынгу ФІФА сярод усіх зборных.

Тое, што фінал будзе цікавым, сумненняў няма, матч адбудзецца ў нядзелю, 15 ліпеня, на галоўным стадыёне турніру — «Лужніках». Сустрэча за бронзавыя медалі пройдзе ў суботу ў Піцеры, на поле выйдуць каманды Бельгіі і Англіі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

■ Працяг тэмы

Спачатку — дэталёва вывучыць

Праект магчымай рэканструкцыі Вайсковых могілак прадставілі ўчора журналістам у Мінгарвыканкаме

Мяркуецца частковая мемарыялізацыя комплексу, будзе заменена агароджа, абноўлена ўваходная група, запланавана ўзвядзенне дадатковых пешаходных дарожак, малых архітэктурных формаў з тлумачэннямі па розных групах пахаванняў. Каваныя рашоткі, уваходная група будуць утрымліваць дэкаратыўныя элементы (скульптуры, барэльефы) ваеннай тэматыкі.

Як адзначыла галоўны архітэктар праектаў УП «Мінскпраект» Ганна Аксёнава, прапрацоўваюцца два варыянты рэканструкцыі. Свае прапановы рыхтуюць дзве групы архітэктараў, якія ў тым ліку займаліся праектаваннем мемарыяла па вуліцы Чарвякова і адной з чэргаў мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». «Працуюць прафесіяналы. Будуць праводзіцца дадатковыя комплексныя навуковыя даследаванні па ўсіх магілах, якія ўяўляюць гістарычную каштоўнасць», — цытуе БелТА Ганну Аксёнаву.

Першачарговая задача праекціроўшчыкаў — падрыхтаваць канцэптуальныя прапановы па агароджы тэрыторыі, планіровачных рашэннях і замене малых архітэктурных формаў. Кожная тэрыторыя пахаванняў будзе старанна вывучацца, вызначацца найбольш каштоўныя, якія будуць падлягаць як рэстаўрацыі, рэканструкцыі, так і рамонту. Мяркуецца, што праект будзе вынесены на грамадскае абмеркаванне. У цяперашні час канцэпцыя разглядаецца ў камітэце архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама і Міністэрстве культуры. Затым спецыялісты выканаюць неабходныя чарцяжы.

■ Надвор'е

Дажджы з навальніцамі, а месцамі моцныя ліўні

Але цёпла — днём плюс 20—27 градусаў

На гэтым тыдні ў краіну вярнулася ліпеньская цеплыня, але ў яго другой палове надвор'е зменіцца, калі ўплыў на яго будуць аказваць атмасферныя франты. Чакаецца няўстойлівае з дажджамі надвор'е, але будзе даволі цёпла, расказваюць у Белгідрамеце.

З пятніцы ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будзе вызначаць актыўны атмасферны фронт, які павольна рухаецца ў паўночна-ўсходнім напрамку. А ў выхадныя надвор'е паранейшаму будуць фармаваць атмасферныя франты.

У суботу ўначы па паўночна-ўсходняй частцы і ў паўднёва-заходніх раёнах краіны, у дзённыя гадзіны на большай частцы тэрыторыі чакаюцца дажджы рознай інтэнсіўнасці, якія месцамі будуць суправаджацца навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 12 да плюс 18 градусаў, удзень — 20—27 цяпла. Захаваецца дажджлівае надвор'е і ў нядзелю. Таксама месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—18 цяпла, а днём будзе ад плюс 20 да плюс 27 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак ноччу ў асобных раёнах, удзень на значнай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, якія месцамі будуць суправаджацца навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы — 12—19 цяпла, днём чакаецца плюс 21—27 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ

ЗАМУРАВАНЫЯ СРОДКІ І СПАДЗЯВАННІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі і ў 2015-м справа не зрушылася, дольшчыкі пачалі пісаць лісты ў Мінгарвыканкам, каб ім замянілі забудоўшчыка, абапіраючыся на Палажэнне аб парадку замены забудоўшчыка, распрацаванае Саветам Міністраў. Атрымалі адказ: маўляў, гэта немэтазгодна, не перажывайце, усё дабудуецца.

У 2016 годзе кіраўніка клуба «Сквіч» арыштавалі, і дольшчыкі звярнуліся ў суд Фрунзенскага раёна сталіцы, каб заявіць свае правы. Да таго ж бізнесменам даводзіцца адстойваць права ўласнасці менавіта на матэрыялы, а не на само памяшканне, паколькі аб'ект нерухомасці незарэгістраваны.

Бізнесмены атрымалі дзевяць завочных (без прысутнасці другога боку — кіраўніка «Сквіч») рашэнняў суда. У дакументах прызнавалася права ўласнасці дольшчыкаў на будаўнічыя матэрыялы, а таксама факт гатоўнасці памяшканняў да эксплуатацыі. Суд прызнаў за бізнесменамі і права на ўвядзенне аб'ектаў у эксплуатацыю і абавязаў Мінскае гарадское агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры зарэгістраваць памяшканні з указаннем уладальнікаў.

У гэты час генпадрадчык, будаўнічы трэст № 7, абвясціў аб банкруцтве забудоўшчыка. І **антыкрызісны кіраўнік Павел БУХВАЛАЎ** падаў патрабаванне аб адмене рашэнняў суда, матывуючы гэта тым, што суд праходзіў без прысутнасці адказчыка, патрабаванні на права ўласнасці дольшчыкамі неабгрунтаваныя, а маёмасць — неідэнтыфікаваная. Ён пісьмова папярэдзіў дольшчыкаў, што адмаўляецца ад выканання абавязкаў перад бізнесменамі, якія ўзяў на сябе «Сквіч».

— Скасаваць дагавор у аднабаковым парадку нельга, а нашай згоды на гэта не было, — запэўніваюць дольшчыкі.

— Рашэнне прымалася завочна, без адказчыка. Як адказчык з'явіўся (у асобе антыкрызіснага кіраўніка. — **Аўт.**), пастанову і адмянілі. Тым больш што нельга зарэгістраваць пабудову без яе канчатковай рэалізацыі. Бо заяву на рэгістрацыю павінен падаваць забудоўшчык, — адказвае антыкрызісны кіраўнік.

— Згодна з пунктам 1 артыкула 130 Грамадзянскага кодэкса, да нерухомай маёмасці адносяцца сярод іншых і незавершаныя будаўніцтвы, закансерваваныя капітальныя пабудовы. А Палажэнне аб долевым будаўніцтве і заканадаўства не змяшчаюць забароны на прызнанне правоў уласнасці на незавершаны будаўніцтвам аб'ект, — не пагаджаюцца з такім меркаваннем у адвакацкім бюро «ПРЫНЦЭПСКАНСАЛТ», якое вядзе справы дольшчыкаў.

Тым не менш усе рашэнні, што прызнавалі права дольшчыкаў на будматэрыялы, з якіх складзена нерухомасць, той жа суд Фрунзенскага раёна адмяніў.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Прадаць нельга аддаць

Цяпер бізнесмены намагаюцца выключыць сваю нерухомасць са складу маёмасці даўжніка і даказаць, што яна ўвогуле ім належыць, аднак зрабіць гэта ніяк не атрымліваецца. Дольшчыкаў вымушаюць прызнаць сябе не ўласнікамі памяшканняў, а крэдыторамі (што аўтаматычна пазбавіць іх права прэтэндаваць на маёмасць, якую яны аплацілі). Людзям прапануюць пачакаць, пакуль маёмасць прададуць і ім вернуць грошы. Аднак гэта будуць зусім не тыя сумы, якія яны ўнеслі, бо крэдытораў у «Сквіч» хапае і без падманутых бізнесменаў.

— Крэдытораў назбіралася на 16 мільёнаў рублёў, а на аўкцыёне за маёмасць просяць 12, — кажа **Ігар СТАНКЕВІЧ, адзін з дольшчыкаў.** — На ўсе даўгі грошай ужо не хопіць.

Каб адстаяць свае правы, дольшчыкі пачалі пісаць у розныя інстанцыі.

— Ва ўпраўленні па санацыі і банкруцтве Міністэрства эканомікі нам параілі стаць крэдыторамі і напісалі, што антыкрызісны кіраўнік усё робіць правільна, згодна з законам аб банкруцтве. А пра Указ Прэзідэнта № 263 «Аб долевым будаўніцтве аб'ектаў у Рэспубліцы Беларусь», які фактычна вышэйшы за закон і які фактычна абараняе нашы правы, не было ні слова, — гаворыць **Юлія ФРОЛКІНА, адна з дольшчыкаў.**

— Нас падводзяць пад закон аб банкруцтве, згодна з якім наша маёмасць будзе пушчана з аўкцыёна, хоць мы абаронены ўказам Прэзідэнта. Чаму гэты ўказ выконваюць толькі простыя людзі, а дзяржаўныя інстанцыі ігнаруюць? — задаецца пытаннем Ігар Станкевіч. — Мы нічога не просім у дзяржавы, гатовыя за свае сродкі дарабіць унутраную частку памяшканняў, будаўніцтва якіх мы ўжо аплацілі. Нашы офісы гатовыя больш як на 80 %, проста аддайце іх нам ва ўласнасць.

Заплаціць — не значыць атрымаць ва ўласнасць?

Суд Фрунзенскага раёна пакінуў частку патрабаванняў дольшчыкаў без разгляду, па некаторых — спыніў выкананне, матывуючы гэта тым, што яны яму не падведамасныя, заўважаюць адвакаты. Эканамічны суд разгледзеў патрабаванні дольшчыкаў па сутнасці, аднак не задаволіў іск, нягледзячы на прадстаўленыя імі заключэнні кампаніі «Судова-экспертная калегія». Рабіліся экспертызы, кожная з якіх абышлася істцам у больш як 2000 рублёў, каб пацвердзіць, што ім належаць будматэрыялы.

Але суд вынес рашэнне: «Колькасны склад, дакладнае найменне, іншыя характарыстыкі маёмасці, якая падлягае выключэнню, ісцец не ўказаў, паколькі пералік маёмасці, што падлягае выключэнню, указаны зыходзячы з атрыманага істцом заключэння экспертызы...»

Атрымліваецца, пералік матэрыялаў, прадстаўлены экспертызай, недакладны, бо ў ім не падлічана дакладная колькасць цаглінак і кубаметраў бетону, што пайшлі на будоўлю сцен, якія аплацілі дольшчыкі. Больш за тое, ім паведамілі, што довад істца пра наяўнасць заключэння камісіі ўвогуле «не прымаецца судом пад увагу», паколькі «не паўплывае на прынятае судом рашэнне».

Далей — болей. Суд піша, што «прадстаўленыя істцом дагавор стварэння аб'екта долевага будаўніцтва, плацежныя дакументы аб пералічэнні дольшчыкам грашовых сродкаў па дагаворы, даведка, на думку прадстаўніка адказчыка, не сведчаць аб узнікненні права ўласнасці на ўказаныя будаўнічыя матэрыялы». Атрымліваецца юрыдычны казус: тыя, хто заплаціў грошы за будматэрыялы, не з'яўляюцца ўласнікамі гэтых самых матэрыялаў.

— Матэрыялы, на якія прэтэндуюць дольшчыкі, складаюць першы паверх высотнага будынка. Як вызначыць у апорнай сцяне, якія цагліны ў ёй належаць дольшчыкам, а якія — будынку? Камунікацыі таксама агульныя ў доме. Якая частка з іх належыць бізнесменам? — адстойвае сваю пазіцыю Павел Бухвалаў.

Міравое пагадненне за два мільёны долараў

Антыкрызісны кіраўнік прапануе дольшчыкам вырашыць канфлікт мірам.

— Я аддаю ім увесь адміністрацыйны комплекс будынка, яны здымаюць патрабаванні да «Сквіча» і за свае сродкі дабудоўваюць памяшканні, — кажа ён. — Для поўнага завяршэння аб'екта патрэбна каля двух мільёнаў долараў. Хай дольшчыкі дакладваюць свае сродкі, дабудоўваюць і забіраюць усё сабе. Горад не вырашыць іх праблемы. І я не маю права аддаваць перавагу гэтым бізнесменам са шкодай для іншых крэдытораў.

Чамусьці ў нас лічыцца, што ў бізнесменаў грошы заўсёды ёсць і калі яны збудавалі адзін раз — зробяць гэта яшчэ...

— Я прадала кватэру ў Расіі і з сям'ёй пераехала сюды. Усе грошы ўклала ў гэтае памяшканне. Я нават уявіць не магла, што можна здаць дом у эксплуатацыю, не дарабіўшы першы паверх, — гаворыць Юлія Фролкіна.

— Я хацела збудаваць менавіта сваё маленькае памяшканне для гандлю оптыкай, каб не арандаваць яго, бо гэта таксама вялікія грошы, — расказвае **Вольга ГОЛУБ, яшчэ адна дольшчыца.** — Я шмат гадоў не ездзіла ў адпачынак, усе грошы сюды аддала. Лепш бы ўжо кватэру набыла ў гэтым жа доме. А то мне кажуць, што я не маю тут ніводнай цаглінкі.

А цяпер гэтым людзям прапануюць шукаць агулам яшчэ два мільёны долараў і дабудоўваць да канца ўвесь дом, а не толькі свае памяшканні...

— Магчыма, у міравым пагадненні нехта пагодзіцца знізіць свае патрабаванні. І такія людзі, якія ўжо бачаць, што не вернуць усю ўкладзеную суму, ёсць. Яны згодны атрымаць напалову менш і прадаць сваю долю астатнім крэдыторам, — дадае Павел Бухвалаў. — Я бачу толькі такое выйсце.

Першыя таргі, дарэчы, прайшлі 9 ліпеня, і, як і меркавалася, ахвотнікаў вылажыць такую суму не знайшлося. Дольшчыкаў чакаюць чарговыя сустрэчы з даўжніком і прапановы магчымасцяў дамовіцца.

«Звязда» працягне сачыць за развіццём падзей.

Ірына СІДАРОК.

■ Падрабязнасці

Новыя фігуранты ў «медыцынскай» справе

Нягледзячы на праводзімыя следчыя дзеянні і прафілактычныя мерапрыемствы, у сферы аховы здароўя выкрываюцца новыя факты карупцыі, канстатаваў старшыня КДБ Валерый Вакульчык. Днямі былі праведзеныя новыя затрыманні высокапастаўленых медыцынскіх чыноўнікаў.

У прыватнасці, намеснік міністра аховы здароўя Ігар Ласіцкі затрыманы і змешчаны пад варту за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю, па арганізацыі дзяржрэгістрацыі вырабаў медыцынскага прызначэння, а таксама лаяльнае стаўленне пры выбары пастаўшчыкоў медыцынскай тэхнікі. «Сумы хабараў вар'іраваліся ад $2,5 тыс. да $10 тыс.», — праінфармаваў Вакульчык.

Сярод затрыманых таксама генеральны дырэктар прадпрыемства «Белфармацыя» Вячаслаў Гніцій, які атрымліваў хабар за арганізацыю першачарговых разлікаў з камерцыйнымі структурамі, а таксама за выбар «патрэбных» пастаўшчыкоў медыцынскай прадукцыі. Акрамя таго, 23 чэрвеня пры атрыманні чарговага хабару ў $5 тыс. затрыманы дырэктар ААТ «Экзон» Валерый Васкевіч, які на працягу доўгага часу атрымліваў незаконнае грашовае ўзнагароджанне за заключэнне дагавораў на пастаўку прадукцыі на адрас ААТ і паступовы пераход па сутнасці дзяржаўнага прадпрыемства пад кантроль камерцыйнай структуры. Усяго ў гэтым выпадку гаворка ідзе пра суму не менш як $25 тыс.

Таксама Камітэт дзяржаўнай бяспекі затрымаў за хабар дырэктара РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Аляксандра Бялецкага, у яго тайніках знойдзена каля $500 тыс. у эквіваленце, паведаміў Валерый Вакульчык. «Аляксандр Бялецкі затрыманы і ўзяты пад варту за арганізацыю правядзення тэхнічнага абслугоўвання і рамонту медыцынскага абсталявання з боку камерцыйных структур і своечасовую аплату за аказаныя паслугі», — адзначыў старшыня КДБ.

Сярод фігурантаў крымінальных спраў таксама галоўны ўрач 1-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Алег Фамін. Ён затрыманы за садзейнічанне ў арганізацыі закупак медыцынскага абсталявання для патрэб бальніцы. Пры правядзенні вобыску па месцы пражывання Алега Фаміна знойдзена каля $140 тыс. у эквіваленце.

Крымінальныя справы ўзбуджаны ў адносінах да галоўных урачоў 9-й гарадской клінічнай бальніцы сталіцы Валерыя Кушнірэнкі, Мінскай абласной клінічнай бальніцы Андрэя Каралько і Віцебскай абласной клінічнай бальніцы Анатоля Аладзькі. Затрыманы таксама галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Сяргей Карыцька. За ўчыненне злачынстваў, прадугледжаных арт. 430 «Атрыманне хабару», арт. 431 «Дача хабару» і арт. 243 «Ухіленне ад выплаты сум падаткаў, збораў» КК, Камітэтам дзяржбяспекі затрыманы, узяты пад варту, а таксама прыменены іншыя меры стрымання ў адносінах да 37 службовых асоб, а ўсяго — больш за 60 фігурантаў.

Усе яны шматразова атрымлівалі незаконнае грашовае ўзнагароджанне за аказанне садзейнічання ў пастаўцы медабсталявання і медыцынскіх прэпаратаў па завышаных цэнах, што пацвярджаецца вынікамі праводзімых доўгі час аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, паказаннямі сведак і саміх абвінавачаных, а таксама рэзультатамі вобыскаў.

Паводле БелТА

■ Жыллёвае пытанне

Знізіць цэны на інтэрнаты

З такой прапановай выступаюць прафсаюзы

Пасля ўвядзення абласнымі і Мінскім гарадскім выканкамамі платы за карыстанне жылымі памяшканнямі ў інтэрнатах агульная плата за іх павялічылася на 28—41 працэнт у залежнасці ад рэгіёна. Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі занепакоена: калі для жыхароў сталіцы і вобласці гэта сума складае 7-10 працэнтаў ад заробку, то ў іншых рэгіёнах дасягае 30 працэнтаў. Ёсць прыклад, калі санітарка ў Магілёве зарабляе каля 400 рублёў, з якіх 120 трэба аддаць за інтэрнат.

Цяпер прапрацоўваецца варыянт з увядзеннем у рэгіёнах паніжальных каэфіцыентаў на аплату пражывання ў інтэрнаце, выходзячы з фінансавых магчымасцяў прадпрыемстваў, на балансе якіх яны знаходзяцца. Такая практыка існуе ў Мінску. Прафсаюзныя камітэты сумесна з наймальнікамі абмяркоўвалі гэта пытанне, і сёння амаль у палове сталічных інтэрнатаў выкарыстоўваюцца паніжальныя каэфіцыенты і выдзяленне адраснай матэрыяльнай дапамогі.

— Разам з тым такая мера не дазваляе вырашыць праблему высокай платы для многіх катэгорый, у прыватнасці для работнікаў бюджэтных арганізацый, пенсіянераў, адзінокіх мам, для тых, хто пражывае ў інтэрнатах, перададзеных у камунальную форму ўласнасці. У сувязі з гэтым неабходна прыняць цэнтралізаваныя рашэнні аб зніжэнні аплаты для іх і прымяненні адраснай матэрыяльнай дапамогі, субсідый па прынцыпе налічэння субсідый на аплату камунальных паслуг, — лічаць у ФПБ.

Абласным і Мінскаму гарадскому выканкамам ужо даручана заняцца гэтай праблемай. Кантраляваць выкананне згаданых даручэнняў будзе Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

РАГАТЫЯ «АРЭЛІ»

...Эх і слаўны ж быў час — дзяцінства! Калі можна «купацца» ў клопаце і любові дарослых родных людзей, калі можна сваволіць ды шкодзіць — і табе за гэта нічога не будзе, калі можна рабіць самыя неверагодныя рэчы! Пракаціцца на свінні, напрыклад.

Не верыцца, але ж былі часы, калі машыны па вуліцы праязджалі рэдка (добра, як раз на месяц), а вось свінні там гулялі штодня...

Цікавай забавай былі і арэлі — звычайныя: гушкаліся на іх круглы год і ўсе вясковыя дзеці. Мне ж аднойчы пашчасціла як нікому: я праехаўся на... жывых, рагатых арэлях.

А было гэта так. Неяк добрым вясновым днём бацька з маім старэйшым братам пілавалі дровы. Непадалёк ад іх стаяла карова і ела сена. Я ж, перапоўнены энергіяй, бегаў перад ёй то туды, то сюды... Бегаў, відаць, доўга... Як раптам адчуў, што ногі мае... адрываюцца ад зямлі, што я «плыву» ў паветры!

Колькі доўжыся той «заплыў», сцяміць не паспеў — стаў на ногі і трохі ўбаку ад каровы. Яна, як нічога ніякага, зноў нагнулася над сенам.

...І толькі потым я зразумеў, што ёй проста надакучыла мая мітусня перад пысай, і яна — як тая гаспадыня гаршчок — падхапіла мяне на «вілкі» (то-бок на рогі) і паставіла ў іншае месца. Прычым так далікатна і мякка, што я нават не адчуў нязручнасцяў.

Аднак урок засвоіў: і сам перад каровай больш не мітусіўся, і іншым таго не раіў.

Яўген Шастакоў,

г. Гомель.

СХОВАНКА ДЛЯ ГАВАРУНЧЫКА

...Што ні гаварыце, пры камуністах многія вёскі (за ўсе не скажу, бо не ведаю) жылі няблага. Мяркуйце самі: забірала дзяржава здабытае — збожжа, мяса, малако — па так званых закупачных цэнах. Але ж у канцы года быў пераразлік — размеркаванне выручкі. У выніку да тых самых невысокіх закупачных цэн вытворцы, то-бок калгаснікі, апроч трынаццатай зарплаты, у залежнасці ад заробку атрымлівалі надбаўкі (так званыя «кучкі»), і яны па сваёй «вышыні» часам дасягалі гадавога заробку! Як казала адна з нашых цётак, «самашэччыя» грошы!

Цяпер у калгасах ніякіх пераразлікаў ужо не робяць. Старыя спецыялісты пакрысе сыходзяць (узрост), а маладых не дужа заманіш — у іх, як спяваў Высоцкі, «закалка не та». Яны «кінаў» пра заморскае жыццё нагледзяцца і хочуць жыць, як там: мець усё і зараз альбо — атрымліваць, а не зарабляць.

Дык вось. Быў час — засталася гаспадарка без галоўнага заатэхніка, доўга шукала сабе кадра і ўрэшце знайшла. Гаварунчык — якіх пашукаць! Казаў, як пеў: «парадак навядзём», «вытворчасць падымем», «прадукцыяй свет завалім», «грошай займеем»...

Даяркі новыя кашалькі сабе пакуплялі, каб зарплаты дадому насіць.

Але ж ролю кіраўніка той новы «рука-вадзіцель» разумеў літаральна: рукамі сапраўды і вадзіў, і разводзіў, прэмій пазбаўляў, кулаком па стале час ад часу грукаў... А як баланс кармавы зрабіць — дык хоць загадчыку фермы садзіся.

Не на месцы чалавек — усе зразумелі, бо на ферме пры ім яшчэ больш недахопаў стала. Старшыня як ні прыедзе, кожны раз яму гэта кажа...

Дык той, каб не слухаць, хавацца стаў. Старшыня на ферму — заатэхніка няма. Галоўнае — толькі што быў і «раптам знік» — як пад зямлю праваліўся!

Дзе тое месца, людзі, вядома ж, бачылі. На тэрыторыі фермы спісаны дзіравы танк стаяў (цыстэрна для захоўвання малака). Дык заатэхнік, калі што, — туды, у бункер... Глядзіш — «буру» і пераседзіць.

Але ж пытанне аб яго звальненні ўсё роўна паўстала: старшыня сказаў загадчыку фермы, што едзе для апошняй размовы. Заатэхнік, як заўсёды, схаваўся: думаў, відаць, што зноў пранясе. Ды дзе там: старшыня, іншыя спецыялісты рушылі да танка і размову завялі як быццам пра яго, пра танк: непатрэбны, маўляў, трэба было б прыбраць, але як?

Сталі раіцца:

— Давайце трактарам зачэпім і пацягнем.

— Не, асфальт сапсуём.

— Можа, тады на трактар пагрузім? Ці аўтагенам парэжам на лісты... Метал на нешта спатрэбіцца.

— Ды ён саржавеў ужо. А ну *(кажуць слесару)* гахні кувалдай.

Той з размаху і раз, і другі — так і ёсць: іржавы.

— Ды вунь бульдозер на пад'ездзе. Хай каўшом патаўчэ...

Вось тут ужо заатэхнік не вытрымаў: высунуў з люка ўздыблены чуб, потым — спалатнелы твар, ашалелыя ад страху вочы...

Дзіўна было, што неяк вылез яшчэ з цыстэрны, што скочыў на зямлю і нават як бы пабег. Мужыкі ўслед аж зайшліся ад рогату.

...А танк ад фермы і сапраўды прыбралі, амаль разам з заатэхнікам, хоць той і ўпарціўся: на словах даводзіў, што ён — спецыяліст.

Але ж даказваць тое трэба было раней і на справе. А інакш — не схавацца. Нават у «саркафагу».

Соф'я Кусянкова,

в. Лучын, Рагачоўскі раён.

ДАРАГІ ПАДАРУНАК

Згадзіцеся: з шыкам цяпер спраўляюць выпускныя! Даражэнныя ўборы, прычоскі, макіяж, манікюр, педыкюр, відэаздымкі, падарункі настаўнікам...

Вось гэта, апошняе, і раней, дарэчы, было.

...Разам са мной у класе вучылася яшчэ сорак дзяцей, якія ў далёкім 60-м мінулага стагоддзя, што называецца, выпускаліся — выходзілі ў самастойнае жыццё. Гэта было падзеяй і для вучняў, і для настаўнікаў, і, вядома ж, для бацькоў. Таму яны, хоць грошай у калгасе тады і не плацілі, пастараліся — прыбралі нас так, што мы толькі ахалі ды разглядалі адно аднаго!

Але ж расказаць я хачу пра іншае.

У той час настаўнікам дарылі кнігі, каштавалі яны не тое, што цяпер, можна было купіць. Да таго ж у суседстве з намі жыла сям'я настаўнікаў, мы, можна сказаць сябравалі (ва ўсякім разе, калі ім трэба было некуды з'ездзіць, яны прасілі нас паглядзець іх дзяцей, гаспадарку). У выніку гэтых зносін я даведалася, каму і якія кнігі падарыць. (Толькі «русічка» — настаўніца рускай мовы і літаратуры — казала, што ёй лепш бы нейкую рэч).

Такім чынам, спіс мяркуемых падарункаў быў гатовы. Каб іх купіць, мяне і Колю Яўменава аднакласнікі «камандзіравалі» ў Крычаў.

Чаму нас? Сакрэту ніякага: цягнік у райцэнтр прыходзіў апоўначы, пасажырам трэба было шукаць начлег. У мяне ў Крычаве жыла сястра, у Колі цётка.

...Раніцай, перад адкрыццём магазінаў, мы з ім сустрэліся і пачалі закупкі. Кнігі ў дэфіцыце тады не былі яшчэ, так што ўсё патрэбнае мы выбралі досыць хутка, аплацілі. Заставалася знайсці падарунак «русічцы».

У пошуках мы з Колем пайшлі ў бок вакзала. Па дарозе збочвалі ў нейкія крамы, але нічога прыгожага за нашы грошы там, на жаль, не было. І часу не было ўжо таксама: да адпраўлення цягніка заставаліся нейкія хвіліны, калі я ўбачыла краму так званага арза (аддзела рабочага забеспячэння. Былі такія — і прадуктовыя, і прамтаварныя. Для чыгуначнікаў — амаль на кожным вакзале)...

Я куляй уляцела туды і адразу ўбачыла тое, што трэба: ваза для фруктаў — плеценая, з вітага проваду, — можна сказаць, залатая, прыгожая, лёгкая. І, галоўнае, па кішэні: каштуе тры рублі пяцьдзясят капеек. А ў нас ад кніг засталася пяцёрка.

З радасці я ледзь не скачу! Хуценька балабоню прадавачцы пра наш выпускны, пра падарунак настаўніцы, пра цягнік, які вось-вось адправіцца, паказваю пяцёрку...

Тая, як мне здаецца, усё разумее: гэтак жа хуценька аддае мне вазу, следам — рэшту. Я, пакінуўшы ёй свой «дзякуй», куляй выбягаю з крамы, бягу ў бок цягніка, які і праўда ўжо адпраўляецца...

Мы з Колем паспяваем: ускокваем у тамбур, заходзім у вагон. Я кажу яму, што купіла такі падарунак русічцы, хачу паказаць яго, расціскаю кулак і... нічога не разумею, бо там... грошы: нашыя пяць рублёў! Ды паўтара яшчэ... рэшты!

На далоні ў мяне — дальбог не хлушу — яны гарэлі агнём, здавалася — прапаляць руку, бо атрымалася, што я абдурыла прадавачку: мала таго, што вазу ўзяла, за яе не плаціўшы, дык яшчэ і рэшту неяк «вырвала».

...Цягнік з-за гэтага мы з Колем не спынілі. І на хаду выскокваць з яго не сталі, бо назаўтра ж быў выпускны.

1260 год — войска Вялікага Княства Літоўскага разграміла крыжакоў каля возера Дурбэ (Усходняя Латвія). Паражэнне ордэна паслужыла штуршком для шматлікіх паўстанняў заваяваных прыбалтыйскіх народаў, у першую чаргу — прусаў, таксама куршаў, земгалаў і сарэмскіх эстонцаў. Акрамя таго, прыбалтыйскія народы ўсвядомілі неабходнасць аб'яднання з князямі ВКЛ для супрацьстаяння германскім рыцарам. Згодна з летапісамі, бітва адбылася пасля паходу войска вялікага князя Міндоўга на Прусію. Не выключана, што літоўскім войскам у бітве пры Дурбэ камандаваў менавіта сам Міндоўг. Згодна з лівонскай Рыфмаванай хронікай і хронікай Пятра Дуйсбургскага, загінула 150 рыцараў ордэна, шмат простых ваяроў, магістр Бурхард фон Хорнхаўзен, маршал Генрых Ботэль, шведскі прынц Карл, якія ўзначальвалі паход крыжакоў. У палон трапіла каля 15 рыцараў. Адразу ж пасля заканчэння бітвы літоўскае войска адступіла разам з ваеннымі трафеямі ў Літву, не стаўшы працягваць ваенную кампанію ў Курляндыі.



1858 год — нарадзіўся (Мінская губерня) Андрэй Іпалітавіч Вількіцкі, гідрограф-геадэзіст, генерал-лейтэнант. У 1880 годзе скончыў Марскую акадэмію ў Пецярбургу. У 1887-м узначаліў экспедыцыю на Новую Зямлю, дзе вёў гравітацыйныя назіранні. У 1894—1901 гадах пад яго кіраўніцтвам праводзіліся гідраграфічныя даследаванні ад вусця Пячоры да ракі Енісей, у Енісейскім заліве і Обскай губе. У 1907—1913 гадах узначальваў Галоўнае гідраграфічнае ўпраўленне. Аўтар навуковых прац па гідраграфіі і геадэзіі. Памёр у 1913 годзе.

1948 год — нарадзіўся (г. Барысаў) Леанід Пятровіч Козік, беларускі дзяржаўны дзеяч, доктар эканамічных навук, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. У 1985—1990 гадах — дырэктар Барысаўскай швейнай фабрыкі, у 1995—1998-м — член Калегіі, паўнамоцны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь у Міждзяржаўным эканамічным камітэце Эканамічнага саюза СНД, з 1998-га — намеснік прэм'ер-міністра, з 2001-га — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з 2002 года — старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Аўтар прац па пытаннях эканомікі і права.

1878 год — краінамі-ўдзельніцамі Берлінскага кангрэса падпісаны Берлінскі трактат, у адпаведнасці з якім былі перагледжаны ўмовы Сан-Стэфанскага міру 1878 года і ажыццёўлены новы перадзел Балкан. Была пацверджана незалежнасць Чарнагорыі, Сербіі і Румыніі. Паўночная Балгарыя стала незалежнай дзяржавай, Паўднёвая Балгарыя (Усходняя Румелія) засталася пад уладай турэцкага султана, атрымаўшы адміністрацыйную аўтаномію. Да Расіі адышлі вусце Дуная, крэпасці Карс, Ардаган і Батум. Аўстра-Венгрыя акупавала Боснію і Герцагавіну.

1923 год — нарадзіўся Міхаіл Іванавіч Пугаўкін, савецкі і расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР. Здымаўся ў фільмах «Дзяўчаты», «Вяселле ў Малінаўцы», «Дванаццаць крэслаў» і многіх іншых. Памёр у 2008 годзе.

1928 год — нарадзіўся Валянцін Пікуль, савецкі пісьменнік. Аўтар 30 гістарычных раманаў і аповесцяў, у тым ліку «Пяром і шпагай», «Фаварыт», «Гонар маю» і інш. Лаўрэат шматлікіх прэстыжных прэмій у галіне літаратуры. Памёр у 1990 годзе.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.54	21.36	16.42
Віцебск —	4.36	21.33	16.57
Магілёў —	4.44	21.26	16.42
Гомель —	4.49	21.14	16.25
Гродна —	5.11	21.49	16.38
Брэст —	5.20	21.42	16.22

Месяц

Маладзік у 5.48.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Андрэя, Варфаламея, Івана, Мацвея, Піліпа, Пятра, Сафрона, Сімона, Якава.*
К. *Маргарыты, Сары, Андрэя.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Я больш не магу вытрымліваць гэтую дыету, учора ледзь не адкусіла вуха мужу.

— Вуха — гэта нічога. Падумаеш, усяго нейкія 80 калорый...

Калі на дачы смажыш шашлыкі, то кожны, хто падыходзіць, лічыць сваім абавязкам памяшаць вуглі або павярнуць шампуры, хоць ты гэта толькі што рабіў. Але вось калі капаеш зямлю, ніхто з тых, што падышоў, не возьме рыдлёўку і не працягне табою распачатую справу...

Мужык, які згубіў учора барсетку. Ведай: сем тостаў было за цябе!

Пайду пасплю. Так ад мяне шкоды менш...



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2561.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

13 ліпеня 2018 г. № 28 (461)

ТЭМА ТЫДНЯ

«СТАНДАРТ» НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

Фота БелТА.

Пра мінімальны даход і паслугі «крокавай» даступнасці

Амаль 20 гадоў таму ў краіне быў прыняты закон «Аб дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартах». Ім замацаваны гарантыі, якія неабходны, каб забяспечыць асноўныя патрэбы грамадзян. Стандарты прапісаны для розных галін — аховы здароўя, адукацыі, культуры, жыллёва-камунальнага абслугоўвання. І, вядома, для сацыяльнай сферы. Разбіраемся, якія гарантыі па сацыяльных паслугах і падтрымцы, аплаце працы і пенсійным забеспячэнні прадугледжаны ў Беларусі. стар. 5

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

ДАЙСЦІ ДА ТРОХ ТРАЦІН

Якім чынам лепей дыверсіфікаваць экспарт? За кошт чаго будзем яго павышаць? Якія выклікі паўстаюць перад беларускай экспартаарыентаванай эканомікай? На гэтыя пытанні шукалі адказы члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах падчас апошняга выязнога пасяджэння.

Старшыня Пастаяннай камісіі Уладзімір Панцюхоў нагадаў, што ў сярэднетэрміновай праграме развіцця краіны замацаваны ключавы колькасны арыенцір работы па дыверсіфікацыі экспарту: «траціна — траціна — траціна».

«Гэта значыць, што да канца пяцігодкі мы павінны выйсці на раўнамернае размеркаванне экспарту па трох рэгіянальна-краінавых напрамках: краіны ЕАЭС — краіны Еўрапейскага саюза — краіны «далёкай дугі», — адзначыў парламентарый.

Сенатар канстатуе, што задача гэта вельмі няпростая, тым больш — улічваючы дасягнутыя да цяперашняга часу вынікі. Напрыклад, за сёлетнія чатыры месяцы доля рынку ЕАЭС у агульным экспарце склала 41,8 %, Еўрапейскага саюза — 33,7 %, краін «далёкай дугі» — толькі 24,5 %. Няма сур'ёзных змен і ў таварнай структуры экспарту. Захоўваецца высокая доля сыравінных тавараў (калій і нафтапрадукты). «Няма прарыву на рынак Еўрапейскага саюза, нягледзячы на адмену эканамічных санкцый і зняцце абмежаванняў на пастаўку тэкстыльнай прадукцыі. Нягледзячы на значны рост экспартных паставак, адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі не толькі захоўваецца, але і прырастае. За чатыры месяцы 2018-га — на $104 млн», — прыводзіць даныя Уладзімір Панцюхоў.

На яго думку, мы можам і павінны працаваць больш актыўна на знешнім контуры, улічваючы спрыяльную кан'юнктуру рынкаў і вопыт мінулых гадоў. «Для вырашэння задачы дыверсіфікацыі паставак і замацавання на рынках краін «далёкай дугі» дзяржава павінна «падставіць плячо» экспартаарыентаваным прадпрыемствам. стар. 3

Грошы пад нагамі

Аграрыям толькі трэба сагнуцца і зарабіць іх стар. 4

Еўрадровы па заяўцы

Што робіць жыццё ў аграгарадку яшчэ больш прывабным? стар. 14

«Прывітанне, суседка!»

Як састарэлым дапамагаюць дасылаць відэа адно аднаму стар. 14

Сэрвіс для перавозчыка

Калі ў «Каменным Лозе» адкрыецца лагістычны цэнтр? стар. 16

Гасцініца амаль дарма

Купіць — танней, чым зняць нумар стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Новы этап — новыя магчымасці

Беларуская дэлегацыя наведала інаўгурацыю турэцкага Прэзідэнта

У пачатку тыдня адбылася цырымонія інаўгурацыі Прэзідэнта Турэцкай Рэспублікі Рэджэпа Таіпа Эрдагана. Кіраўніком айчыннай дэлегацыі на мерапрыемстве быў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.

Праграма знаходжання спікера верхняй палаты атрымалася насычанай: акрамя двухбаковых сустрэч з членамі ўрада Турцыі і кіраўнікамі замежных дэлегацый, была запланавана сустрэча з Ісмаілам Кахраманам — выконваючым абавязкі спікера парламента Турцыі да абрання новага спікера 13 ліпеня 2018 года.

У цырымоніі інаўгурацыі традыцыйна прынялі ўдзел многія замежныя дэлегацыі, у тым ліку — з краін СНД, Еўропы, Цэнтральнай Азіі і Блізкага Усходу. Дзясяткі прэзідэнтаў, спікераў парламентаў, прэм'ер-міністраў і іншых высокіх службовых асоб прысутнічалі на мерапрыемстве.

Нагадаем, 9 ліпеня ў 18 гадзін Рэджэп Таіп Эрдаган прынёс прысягу і зрабіў сваю першую заяву, а таксама аб'явіў склад свайго кабінета. Дарэчы, згодна з унесенымі папраўкамі ў канстытуцыю краіны пасада прэм'ер-міністра была скасаваная, форма праўлення стала прэзідэнцкай, таму Рэджэп Таіп Эрдаган атрымаў вельмі высокія паўнамоцтвы.

На варце здароўя

Фармацэўтычны завод у Скідзелі запусціць у кастрычніку бягучага года

Аб гэтым дамовіліся на сустрэчы старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, куратар беларуска-індыйскага супрацоўніцтва Міхаіл Мясніковіч і індыйскія інвестары, якія рэалізуюць праект па будаўніцтве фармацэўтычнага прадпрыемства «Навалок».

Што дасць гэты завод нашай краіне? Істотна ўзрасце вытворчасць айчынных запатрабаваных лекаў для патрэб унутранага рынку Беларусі і на экспарт.

Падчас сустрэчы бакі абмеркавалі і далейшае развіццё праекта: плануецца арганізацыя сінтэзу субстанцый для вытворчасці лекаў ад дыябету, кардыязахворванняў і СНІДу.

Гэта не першы беларуска-індыйскі праект у галіне фармацэўтыкі: фактычна завершана будаўніцтва фармзаводаў у Бешанковічах, таксама вядуцца работы па будаўніцтве завода ў Калядзічах.

Міхаіл Мясніковіч станоўча ацаніў працу індыйскіх партнёраў, звярнуў увагу на пытанні якасці прадукцыі, падрыхтоўкі кваліфікаваных работнікаў і афармлення дакументацыі.

Ад нацыянальнага да міжнароднага

У Савеце Рэспублікі абмеркавалі далейшую дзейнасць па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

Гэта тэма стала ключавой на сустрэчы намесніка старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яны ШЧОТКІНАЙ, членаў Савета па ўстойлівым развіцці з пастаянным каардынатарам ААН у Беларусі Іаанай Казана-Вішнявецкі і кіраўнікамі арганізацый сістэмы ААН у нашай краіне.

На думку Мар'яны Шчоткінай, пасля стадыі станаўлення нацыянальнай архітэктуры дасягнення Мэт устойлівага развіцця варта звярнуць увагу на больш маштабны праект, які можна распрацаваць і рэалізаваць разам з міжнароднай супольнасцю. Ён будзе накіраваны на функцыянальныя арыенціры ў рабоце па дасягненні МУР, упэўнена віцэ-спікер верхняй палаты.

Нагадаем, зараз асноўная задача ўсіх зацікаўленых бакоў — удзел у фарміраванні канцэпцыі Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця на перыяд да 2035 года. Яна распрацоўваецца ўрадам. Акрамя таго, нельга забываць аб стварэнні адзінай сістэмы каардынацыі дзейных праграм.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

Падтрымаць статус міратворчай платформы і знайсці партнёраў

У Мінску пачаўся штогадовы семінар для кіраўнікоў консульстваў і дыппрадстаўніцтваў, падчас якога яны абмяркуюць шырокі спектр пытанняў міжнароднага супрацоўніцтва.

ВА ЎМОВАХ СУПЯРЭЧНАСЦЯЎ

«На працягу пяці дзён мы пагаворым аб многіх ключавых пытаннях нашай сумеснай працы. Прааналізуем, як выконваюцца эканамічныя і палітычныя задачы, якія год таму перад намі паставіў Прэзідэнт на нарадзе па прыярытэтах знешняй палітыкі краіны», — звярнуўся да сваіх падначаленых **міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ**.

Асаблівая ўвага, паводле яго слоў, будзе ўдзелена тэматыцы прасоўвання турыстычных паслуг і падрыхтоўкі да правядзення ў нашай краіне ў 2019 годзе Еўрапейскіх гульняў.

Кіраўнік МЗС адзначыў, што свае задачы дыпламаты рэалізуюць у няпростых абставінах, калі супярэчнасцяў паміж дзяржавамі не становіцца менш. На высокім узроўні захоўваюцца канфлікты, санкцыі, контрсанкцыі, у тым ліку і ў адносінах паміж некаторымі асноўнымі партнёрамі Беларусі.

Пры гэтым ён адзначыў, што тая знешняя палітыка, якая праводзіцца краінай у цяперашняй сітуацыі па падтрыманні паважлівага і раўнапраўнага дыялогу, пацвярджае свае актуальнасць і запатрабаванасць на практыцы. За краінай ужо замацаваўся статус міратворчай пляцоўкі па ўрэгуляванні рэгіянальных канфліктаў, дзякуючы якой аднаўляецца ўзаемны давер і зніжаецца напружанасць у Еўропе.

«Статус досыць адказны, дазваляе па-новаму зірнуць на Беларусь шматлікім палітычным і эканамічным партнёрам. Разам з тым гэты статус мае патрэбу ў паўсядзённай настойлівай і карпатлівай працы па яго пацвярджэнні», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Таксама ён нагадаў, што пытанні эканомікі былі і застаюцца асноўным крытэрыем ацэнкі дзейнасці кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульстваў.

Фота БелТА.

СУМЕСНА З ПАРЛАМЕНТАМ

Важнай часткай семінара стала сустрэча беларускіх дыпламатаў з кіраўнікамі двухбаковых міжпарламенцкіх груп супрацоўніцтва ў Савеце Рэспублікі.

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА адзначыла, што апошнім часам супрацоўніцтва паміж парламентарыямі розных краін актывізавалася, адбываецца шмат візітаў, насычаных эканамічнай тэматыкай.

— Нам патрэбны веды і інфармацыя, якімі валодаеце вы, незалежна ад накіраванасці двухбаковых адносін, — звярнулася да дыпламатаў віцэ-спікер. — І перш за ўсё гэта — заканадаўства. У кожнай дзяржаве ёсць пэўныя поспехі, якія можна экстрапаліраваць на нашу краіну.

Пра тое, што ўзаемадзеянне паміж кіраўнікамі дыпламатычных місій і кіраўнікамі краінавых груп у парламенце ўзаемна карыснае і Савету Рэспублікі, і Міністэрству замежных спраў, казаў на сустрэчы **намеснік міністра замежных спраў Андрэй ДАПКЮНАС**. Узаемадзеянне гэта не абмяжоўваецца ўласна праблематыкай парламенцкай дзейнасці, дадаў дыпламат. «У асобе кіраўнікоў краінавых груп мы маем не проста парламентарыяў, мы маем вопытных дзяржаўных дзеячаў, якія валодаюць сур'ёзным бачаннем і агульнага дзяржаўнага парадку, і ў тым ліку магчымасцяў канкрэтнага краінавага кірунку», — растлумачыў ён. Андрэй Дапкюнас заклікаў сенатараў да ініцыятывы і запэўніў, што міністэрства будзе самым зацікаўленым памочнікам у далейшым наладжванні парламенцкага ўзаемадзеяння.

НАД ПАЛІТЫКАЙ

Яшчэ адзін аспект, які быў закрануты на сустрэчы ў Савеце Рэспублікі, — дасягненне Мэт устойлівага развіцця да 2030 года. Віцэ-спікер, якая з'яўляецца нацыянальным каардынатарам па гэтай тэме, паведаміла кіраўнікам дыпламатычных місій, што ў найбліжэйшы час плануецца яе справаздача кіраўніку дзяржавы.

Фота БелТА.

— Мы вельмі цесна тут працуем з Міністэрствам замежных спраў, — звярнула ўвагу сенатар. — Гэта была ініцыятыва міністэрства, задачы якога прыгожа ўпісваюцца ў Мэты ўстойлівага развіцця.

Мар'яна Шчоткіна праінфармавала беларускіх паслоў аб тым, што ўжо зроблена Беларуссю на шляху дасягнення 17 Мэт устойлівага развіцця і звярнула ўвагу дыпламатаў на тое, што зараз Беларусь лідзіруе ў працэсе дасягнення Мэт устойлівага развіцця і гэту пазіцыю нельга страціць. Наша краіна адна з першых прадставіла добраахвотны нацыянальны даклад на Палітычным форуме высокага ўзроўню па ўстойлівым развіцці пад эгідай Эканамічнага і сацыяльнага Савета ААН. Мы правялі першы рэгіянальны форум нацыянальных каардынатараў.

«Самы галоўны прынцып — нікога не пакідаць убаку, — падкрэсліла нацыянальны каардынатар. — Гэтым прынцыпам сёння кіруюцца палітыка і эканоміка ў любой краіне. Мэты кладуцца ў аснову стратэгій устойлівага развіцця краін». Мар'яна Шчоткіна папрасіла супрацоўнікаў МЗС не заставацца ўбаку і садзейнічаць руху да ўстойлівага развіцця.

Ілья КРЫЖЭВІЧ,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ТРЭБА БЫЦЬ БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ

НАМЕСНІК кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ЖАЎНЯК сустрэўся ў Віцебскім аблвыканкаме з кіраўнікамі мясцовай прадстаўнічай улады, ідэалагічным актывам вобласці. Ён у сваім выступленні выказаў меркаванне, як зрабіць працу дэпутатаў мясцовых саветаў больш плённай.

Фота БелТА.

— Праца дэпутатаў па-старому не задаволіць. Ад іх чакаюць адкрытасці, высокай публічнай актыўнасці, настойлівасці ва ўзаемадзеянні з выканаўчай уладай у вырашэнні сацыяльных пытанняў. Прыярытэтам у рабоце павінна стаць выяўленне праблем, якія хвалююць насельніцтва, іх актыўнае абмеркаванне. Неабходны пошук шляхоў вырашэння, актыўны ўдзел у дзейнасці мясцовых улад, — адзначыў Уладзімір Жаўняк.

> Людзі павінны ведаць, што прадстаўнікі ўлады гатовыя прыслухвацца да прапаноў, улічыць аргументаваныя думкі... Іх меркаванні могуць быць улічаны пры прыняцці рашэнняў.

Таксама выступоўца нагадаў, што народныя абраннікі — людзі, якія могуць хутчэй дастукацца да начальства, каб данесці, што цікавіць людзей. Менавіта дэпутаты на месцах лепш ведаюць сітуацыю і могуць паўплываць на рашэнне праблемных пытанняў.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што сустрэчы з выбаршчыкамі, у працоўных калектывах, выступленні ў СМІ таксама маюць вялікае значэнне.

Што датычыцца дзейнасці мясцовай улады, то адказным асобам, адзначыў выступоўца, трэба ўмець слухаць людзей і не баяцца ўступаць у дыскусіі з тымі, у каго іншыя погляды.

— Людзі востра рэагуюць на тое, што датычыцца іх інтарэсаў. У якасці прыкладаў можна прывесці размяшчэнне асабліва небяспечных вытворчасцяў, высечку дрэў, ушчыльненне забудовы, — падкрэсліў Уладзімір Жаўняк.

Людзі павінны ведаць, што прадстаўнікі ўлады гатовыя прыслухвацца да прапаноў, улічыць аргументаваныя думкі... Іх меркаванні могуць быць улічаны пры прыняцці рашэнняў. Гэта дазволіць пазбегнуць грамадскай напружанасці, паспрыяе аўтарытэту адказных асоб раённага, гарадскога ўзроўняў.

Уладзімір Жаўняк заклікаў ідэолагаў актыўней карыстацца сучаснымі сродкамі інфармавання людзей. Трэба не забываць пра рэаліі часу: неабходна быць на сувязі з землякамі і ў сеціве.

— У сучасных умовах ідэалагічны актыў павінен валодаць новымі кампетэнцыямі, уменнем прымяняць сучасныя сродкі камунікацыі, працаваць з рознымі катэгорыямі грамадзян, — працягнуў спікер.

Работнікам вертыкалі ўлады неабходна весці дыялог, аргументавана спрачацца, купіраваць канфлікты, праводзіць інфармацыйныя кампаніі... Сёння нельга проста давесці да людзей цытаты з мясцовых газет і тэлеканалаў, агучыць і супакоіцца. Людзі ўжо не прымаюць аднабаковай сувязі. А хочуць атрымліваць канкрэтныя адказы на свае пытанні. Як і ведаць, што іх праблемы заўважылі, што яны ўдзельнічаюць у абмеркаваннях планаў развіцця сваіх населеных пунктаў, уплываюць на працэс, растлумачыў ён.

Важную ролю ў зваротнай сувязі абавязаны іграць дзяржаўныя мясцовыя СМІ. Іх сайты павінны быць канкурэнтаздольнымі, стаць віртуальнай пляцоўкай для абмену думкамі. Тады давер да іх узрасце і павысіцца іх папулярнасць.

> Праца дэпутатаў па-старому не задаволіць. Ад іх чакаюць адкрытасці, высокай публічнай актыўнасці, настойлівасці ва ўзаемадзеянні з выканаўчай уладай у вырашэнні сацыяльных пытанняў. Прыярытэтам у рабоце павінна стаць выяўленне праблем, якія хвалююць насельніцтва, іх актыўнае абмеркаванне. Неабходны пошук шляхоў вырашэння, актыўны ўдзел у дзейнасці мясцовых улад.

Уладзімір Жаўняк агучыў і пытанні ў галіне маладзёжнай палітыкі. Не сакрэт, што юнакі і дзяўчаты часам пакідаюць Радзіму, бо ўпэўненыя, што за мяжой у іх больш перспектыў, шанцаў дасягнуць лепшага ўзроўню жыцця. Таму важна даць ім магчымасць рэалізаваць сябе ў Беларусі. Для гэтага трэба ствараць умовы для самарэалізацыі моладзі. Каб папярэдзіць маладзёжную міграцыю, трэба перагледзець схему адпаведнай палітыкі.

Ад грамадскіх арганізацый, у тым ліку ветэранскай, жаночай, маладзёжнай, улада чакае пастаяннай плённай працы.

Падчас сустрэчы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адказаў на пытанні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДАЙСЦІ ДА ТРОХ ТРАЦІН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Падтрымка экспарцёраў за кошт паслаблення курса беларускага рубля сябе вычарпала, — лічыць сенатар. — Пры гэтым бюджэтная падтрымка экспарту сёння рэалізуецца фактычна толькі па дзвюх схемах, прадугледжаных ва ўказах кіраўніка дзяржавы ад 25 жніўня 2006 г. № 534 і ад 24 верасня 2009 г. № 466. У 2017 годзе ў рамках такой падтрымкі было асвоена 164 млн рублёў, або ў эквіваленце $85 млн. На 2018 год у бюджэце на гэтыя мэты прадугледжана 172 млн рублёў, што з улікам прагнознай дынамікі абменнага курса таксама эквівалентна $85 млн».

Прытым нязначны прырост бюджэтных расходаў на развіццё экспарту ўрад тлумачыць зніжэннем працэнтных ставак па крэдытах, але дадатковыя меры падтрымкі, нават кропкавыя або сектаральныя, не прапануюцца, адзначае старшыня Пастаяннай камісіі. Міжтым дыверсіфікацыя заўсёды з'яўлялася найлепшай стратэгіяй супраць рызык невядомага, якія на дадзены момант усё яшчэ захоўваюцца.

Выступленні прадстаўнікоў сусветнай эліты са сфер бізнесу, фінансаў, палітыкі, грамадскіх адносін на Сусветным эканамічным форуме ў Давосе (які адбыўся ў студзені 2018 года) паказалі, што сёння, на жаль, няма выразнай узгодненай пазіцыі па шляхах глабальнага развіцця. Палітыка гандлёвага пратэкцыянізму перажывае «рэнесанс».

«Прыкладаў хапае. Дональд Трамп паслядоўна рэалізоўвае прынцып «Амерыка перш за ўсё», ініцыіруе павышэнне ўвазных тарыфаў на адчувальныя для сваіх гандлёвых партнёраў пазіцыі. Люстэркавы адказ Кітая не прымусіў сябе доўга чакаць. Адбываецца рэвізія поглядаў на светапарадак, які быў актуальны на працягу апошніх 15—20 гадоў. Глабалізацыя паступова губляе сваю прывабнасць. Ёй на змену прыходзіць парадыгма адасобленага развіцця. Гэта трывожны трэнд. І ў першую чаргу — для малых і сярэдніх эканомік, якія, як правіла, з'яўляюцца больш адкрытымі і могуць аказацца ізаляванымі з усімі негатыўнымі наступствамі. Да такіх краін адносіцца і Беларусь з паказчыкам адкрытасці эканомікі 1,3 (для параўнання: у Германіі — 0,8, у Кітая — 0,4, у ЗША — 0,3). Таму зараз самы час і ў гэтым кірунку «прыкрыць тыл», — рэзюмуе парламентарый.

> Гэта значыць, што да канца пяцігодкі мы павінны выйсці на раўнамернае размеркаванне экспарту па трох рэгіянальна-краінавых напрамках: краіны ЕАЭС — краіны Еўрапейскага саюза — краіны «далёкай дугі».

Вераніка ПУСТАВІТ.

Галіна ТРЫБУНАХ:

«У сельскай гаспадарцы грошы ляжаць паўсюль, трэба толькі сагнуцца і падняць іх»

Адкрытае акцыянернае таварыства «Звязда» мінулым годам заняло ўсе прызавыя месцы ў сваім Чачэрскім раёне. Дарэчы, яно мае неблагія вынікі і ў маштабах краіны. Напрыклад, летась у сельскагаспадарчых арганізацыях Беларусі сярэдні ўдой на карову ўпершыню перавысіў пяць тон, а ў гэтай гаспадарцы з Гомельшчыны надойвалі 6300 літраў ад рагулі. Пры даволі нізкай бальнасці глебы (24) тут сабралі звыш 45 цэнтнераў з гектара. Дырэктара гаспадаркі Галіну Трыбунах сёння многія ведаюць не толькі як паспяховага гаспадара, але і як чалавека, які ўздымае праблемныя пытанні сельскай гаспадаркі на ўзроўні краіны. Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні штодзень вядзе дыялог не толькі па вытворчых пытаннях. Да яе звяртаюцца людзі са сваімі штодзённымі набалелымі праблемамі. Яна разважае пра тое, як зрабіць Беларусь краінай, дзе будзе ўтульна і прыемна жыць нашчадкам.

— Дарэчы, пры сустрэчах людзі часта просяць дапамагчы апрацаваць зямлю, выдзеліць сена, салому ці рэалізаваць ім збожжавыя культуры. Гэта тыя пытанні, якія проста вырашыць, што мы і робім. Ёсць куды больш складаныя. Напрыклад, забеспячэнне чыстай вадой. Сёння ў многіх райцэнтрах няма станцый абезжалезвання. Грашовыя сродкі вышукваюцца, але за адзін дзень гэта ж не зробіш. Шмат пытанняў, якія датычацца жыллёва-камунальнай гаспадаркі і аховы здароўя. Напрыклад, трэба хутчэй уводзіць у дзеянне электронны рэцэпт. Гэта магло б спрасціць жыццё жыхароў аддаленых населеных пунктаў, якія вымушаны пастаянна прымаць пэўныя прэпараты.

— Якія праблемы за апошні год атрымалася вырашыць?

— Сёлета ў нас узнікла сур'ёзная праблема па новым паліклінічным будынку Чачэрскага тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання. У ім прарвала трубы на другім паверсе і затапіла першы. Нягледзячы на тое, што пабудова была на гарантыі, падрадчыкі не спяшаліся ліквідаваць хібы і прыйшлося ўмяшацца ў гэтую справу. Пасля чаго праблему атрымалася вырашыць за кошт будаўнікоў. У Чачэрску ў нас ёсць жылы дом, дзе былі праблемы з выцяжкай. Па патрабаваннях жыхароў туды прыязджалі спецыялісты ЖКГ, але пытанне не вырашалася. Людзі звярнуліся да мяне, пасля чаго падрадчыкі ліквідавалі недахопы. У нас недалёка ёсць вёска Покаць. Яна вельмі доўгая, і пенсіянеры папрасілі зрабіць у населеным пункце дадатковы прыпыначны пункт. Мне ўжо прыйшоў адказ, што ў жніўні яго абавязкова ўстановяць.

— Сёння адно з самых актуальных пытанняў, асабліва на вёсцы — працаўладкаванне...

— Тое, што цяпер заканадаўства дазваляе лягчэй развівацца малому бізнесу, прынесла плённы вынік. У нашым далёкім ад абласнога цэнтра рэгіёне, напрыклад, з'явіліся прадпрымальнікі, якія займаюцца выпечкай кандытарскіх вырабаў ці развозам піцы. Людзі зрабілі свой невялікі бізнес і цяпер добра працуюць. Пры гэтым ёсць і праблемы. Часта да мяне прыходзяць працаўладкоўвацца маладыя спецыялісты, якія гавораць: «Я да вас на адпрацоўку». Нядаўна такі малады спецыяліст проста закідаў мяне пытаннямі — і ўсе выключна пра грошы. У маладых патрабаванні значна вышэйшыя, чым яны самі могуць даць. Я кажу: « Ты зможаш тут працаваць? Ці толькі пакуль будзеш атрымліваць выплаты як малады спецыяліст? Ты ішоў вучыцца, каб атрымліваць забяспечанае ад працы на зямлі?» Хаця, канешне, ёсць і іншыя — тыя, хто хоча працаваць. У нас павінна быць дастойная змена. Нам трэба даказаць усім, што сельская гаспадарка — гэта харчовая бяспека краіны, якую гарантуюць нашы людзі.

— Але ж іх неяк трэба сёння стымуляваць да працы? Як?

— Я бываю не толькі ў сваім, Чачэрскім, але і ў іншых раёнах: Рагачоўскім, Кармянскім, Буда-Кашалёўскім. На жаль, бачу гаспадаркі, у якіх вельмі дрэнная становішча. Людзі там атрымліваюць мінімальную заработную плату — пражытковы мінімум. Мне здаецца, што гэта перашкаджае працаваць. Людзі толькі адбываюць час на працы. Лічаць, што ім павінны ў любым выпадку мінімальны заробак даць. Не разумеюць, што трэба атрымаць прадукцыю, рэалізаваць яе, каб была нейкая выручка, што ўрэшце дасць магчымасць заплаціць ім грошы. У мяне заўсёды баліць душа: заробак павінен быць зроблены. Сёння ў сельскай гаспадарцы грошы ляжаць паўсюль, трэба толькі сагнуцца і падняць іх. Дык многія ж не хочуць гэта рабіць. Калі так будзе надалей, у сельскай гаспадарцы краіны застанецца дзясятак прадпрыемстваў, якія змогуць добра працаваць. Трэба прымаць меры, каб мянялася стаўленне людзей да сваёй працы.

— Аднак такое стаўленне бывае і ў некаторых кіраўнікоў сельскіх гаспадарак. Дарэчы, у асобных за год змяняецца па 3–4 дырэктары.

— Кіраўнікі самі знаходзяцца ў бесперспектыўнай сітуацыі. Папрацуюць з паўгода і кідаюць усё. Калі я толькі прыйшла ў гаспадарку, у мяне таксама былі думкі звольніцца. Але ж хто тады працаваць будзе? Юных кіраўнікоў кідаюць на слабыя гаспадаркі. Магчыма, ім патрэбна больш дапамогі, больш вучобы, парад. У кіраўніка заробак завязаны на сем асноўных паказчыкаў, якія ён павінен выканаць. Калі не выканаў, заробак адпаведна памяншаецца. І калі маладыя прыходзяць на працу, іх пачынаюць пазбаўляць грошай за невыкананне паказчыкаў. Зарплата зводзіцца да мінімуму, і ў людзей прападае інтарэс. А іх толькі папікаюць праблемамі і недахопамі. А параду даць ніхто не можа слушную: як яму працаваць, калі няма тэхнікі, няма і людзей. Запчасткі купіць няма за што. У такіх гаспадарках машына-трактарны парк не абнаўляецца. Вось мы і бачым брудныя фермы, дзе гадамі не вывезена арганіка...

— А рашэнне праблемы дзе?

— На ўзроўні краіны трэба зрабіць вельмі глыбокі маніторынг праблем сельскай гаспадаркі. Патрабуецца абнаўленне машынна-трактарнага парка, а пры гэтым многія не разлічыліся за тэхніку, якую бралі ў лізінг. Мы сёння залежым ад перапрацоўкі, пры гэтым не можам аддаць прадукцыю туды, дзе яе забяруць і дадуць добрую цану. Мы сёння строга замацаваны за сыравіннымі зонамі. І калі ў перапрацоўшчыкаў праблемы, значыць, яны і ў нас. На сённяшні дзень грошы ад перапрацоўшчыкаў нам пералічваюцца ў самым канцы месяца. Нам выдаюцца грошы пад фонд заработнай платы. Пры гэтым вельмі складана расплаціцца за тэхніку, узятую ў лізінг на тры гады. А як толькі пратэрмінавалі аплату па лізінгу — адразу ж налічваюцца вялікія працэнты і пеня. Таму сёння многа сельгаспрадпрыемстваў, якія тэхніку набылі, але не могуць за яе разлічыцца, таму гаспадаркі ў даўгах.

— Галіна Пятроўна, раскажыце пра акцыі, у якіх вы, як член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь бралі ўдзел сумесна з дэпутатамі розных узроўняў.

— Такіх акцый вельмі многа. Разам з Фондам міру — «Дарогамі вайны, міру і працы». Таксама мы клапоцімся пра малодшых школьнікаў і праводзім дабрачынныя акцыі: «Сабяры дзіця ў школу» і «Падары партфель першакласніку». На тэрыторыі нашай Залескай школы сёлета прайшла дабрачынная міжнародная навагодняя ёлка. Напярэдадні Новага года і Раства я заўсёды наведваю з падарункамі цэнтры карэкцыйнага развіцця дзяцей у Чачэрску і Карме. У Гарадцы Рагачоўскага раёна — дапаможную школу-інтэрнат. У Нісімкавічах у нас знаходзіцца бальніца сястрынскага догляду, куды прыязджаю заўсёды з дапамогай. Таксама ў Рагачоўскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Нядаўна мы ім падарылі тэлевізар, прафесійны блэндар і пральную машыну. Рэгулярна аказваем дапамогу для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя, адукацыі і культуры. Напрыклад, самадзейным калектывам у нашым Доме культуры пашылі сцэнічныя касцюмы. Цяпер вось будуем праваслаўную царкву ў гонар святіцеля Васіля Вялікага ў цэнтры нашай гаспадаркі — аграгарадку Залессе.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ДВУХ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ВЕЛИКОЛУКСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ БАРАНОВИЧСКОГО РАЙОНА

№ п/п	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка	Характеристика инженерных коммуникаций	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Площадь земельного участка, га	Назначение участка	Начальная цена объекта (BYN)	Сумма задатка (BYN)	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (BYN)
1	Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский сельисполком, д. Яново, 2-й пер. Пригородный, 6 кадастровый номер 120480405601000098	Участок свободен от застройки	Газопровод, линия электропередачи, водопровод, дорога грунтовая – планируется	0,1500	Для обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	6166,88	616,69	1468,50 Кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона
2	Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский сельисполком, д. Яново, 2-й пер. Пригородный, 8 кадастровый номер 120480405601000099	Участок свободен от застройки	Газопровод, линия электропередачи, водопровод, дорога грунтовая – планируется	0,1500	Для обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	6166,88	616,69	1468,50 Кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ и другие расходы по проведению аукциона

1. **Дата, время и место проведения аукциона:** 16 августа 2018 года, в 14.30 в здании ГУО «Русиновская СШ» (актовый зал) по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский р-н, Великолукский сельисполком, агрогородок Русино, ул. Школьная, 20.

2. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь.

3. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10 %.

4. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

– заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка (10 % от начальной цены);

– копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;

– доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

5. Сумма задатка перечисляется до 13 августа 2018 г. включительно до 14.30 часов на расчетный счет BY 91 AKBB 3641 0022 7005 9130 0000 BYN, код платежа – 4901, фил. 802 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY21802, УНП 200046979.

Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, бульвар Штоккерау, 8а.

Получатель: Великолукский сельский исполнительный комитет, 225351, Брестская область, Барановичский район, д. Великие Луки, ул. Советская,15.

6. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже земельного участка, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего земельного участка. Если два и более участника аукциона согласились с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласился со следующей объявленной им ценой, аукционист предлагает участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона. После объявления участником аукциона своей цены аукционист называет аукционный номер этого участника и предложенную им цену. При этом предложенная участником аукциона цена, равная цене, предложенной другим участником аукциона, не принимается. Участники аукциона объявляют свою цену до тех пор, пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже земельного участка, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему земельному участку. Если после предложения аукциониста участникам аукциона объявить свою цену только один из участников объявит свою цену, аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже земельного участка, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему земельному участку. Если ни один из участников аукциона не предложил свою цену, аукцион в отношении соответствующего земельного участка признается нерезультативным.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для каждого земельного участка.

7. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи:

каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел. (8-0163) 620879; 620878.

8. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, выполнения условий, предусмотренных в протоколе аукциона и решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

9. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 16 июля 2018 года в комиссии с 8.00 до 13.00 и с 14 до 17.00. (каб. № 2 сельисполкома). Последний день приема документов – 13 августа 2018 года до 14.30. Заключительная регистрация участников аукциона – 16 августа 2018 г. с 14.10 до 14.25. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

11. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения по каждому объекту (лоту), выставляемому на аукцион, доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту (лоту), выставляемому на аукцион;

осуществить в двухмесячный срок государственную регистрацию права собственности на земельный участок, получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права собственности на него.

12. Победителю аукциона необходимо будет произвести возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной инфраструктуры к земельному участку, водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение, транспортная инфраструктура, путем единовременного перечисления средств в доход бюджета в течение срока строительства дома, установленного в проектной документации с учетом индексации

■ Кінагід

Верачцы і Навасельцаву — па 80

8 ліпеня народнаму артысту тэатра і кіно Андрэю Мягкову, а 9 ліпеня — народнай артыстцы тэатра і кіно Ліі Ахеджакавай споўнілася па 80 гадоў.

Ахеджакава нарадзілася ў Днепрапятроўску, але дзяцінства правяла ў Адыгеі. Маці Юлія Аляксандрава іграла ў адным з мясцовых тэатраў, а айчым Меджыд Салеханавіч быў галоўным рэжысёрам адыгейскага абласнога тэатра. Нягледзячы на гэта, ён быў катэгарычна супраць таго, каб падчарка працягнула сямейную тэатральную дынастыю. Таму айчым настаяў на яе паступленні ў Маскоўскі інстытут каляровых металаў і золата, таму што хацеў, каб яна атрымала «прыстойную» прафесію.

Лія падала дакументы ў тэхнічную ВНУ, але паралельна яна іграла ў самадзейных студэнцкіх спектаклях. Праз паўтара года яна кінула інстытут і паступіла ў ДІТМ, які скончыла ў 1962 годзе. Затым стала працаваць у Маскоўскім тэатры юнага гледача, дзе яна правяла 16 гадоў, сыграўшы ў мноства спектакляў. У 1977 годзе актрыса перайшла ў трупу тэатра «Сучаснік», дзе іграе і па гэты дзень.

Упершыню на экране Лія Ахеджакава з'явілася ў 1968 годзе. Яна выканала эпізадычную ролю сына аднаго з галоўных герояў у карціне «Вяртанне». Аднак сапраўдны поспех да актрысы прыйшоў пасля навагодняй камедыі Эльдара Разанава «Іронія лёсу, альбо З лёгкай парай!», дзе яна сыграла Таню, сяброўку гераіні Барбары Брыльскай.

Ужо праз два гады, у 1977-м, бліскучая роля сакратаркі Верачкі ў «Службовым рамане» таго ж Разанава зрабіла з Ахеджакавай культавую фігуру. Фразы яе гераіні расцягнулі на цытаты («Менавіта абутак робіць жанчыну жанчынай»), а сама Лія Меджыдаўна за працу ў гэтай стужцы была ўзнагароджана Дзяржаўнай прэміяй РСФСР імя братоў Васільевых. Пасля актрыса працягнула супрацоўніцтва з Разанавым і знялася ў яго «Гаражы», «Нябёсах запаветных» і «Старых клячах».

Яна таксама працавала і з іншымі буйнымі айчыннымі рэжысёрамі. Галоўныя ролі ў кінастужках ёй даставаліся досыць рэдка, аднак Ахеджакава палюбілася гледачу менавіта за сваіх самых яскравых другарадных гераінь.

Андрэй Мягкоў нарадзіўся ў Ленінградзе ў сям'і савецкіх інтэлігентаў.

Малады Мягкоў вырашыў пайсці па слядах бацькоў і скончыў Ленінградскі хімікатэхналагічны інстытут па спецыяльнасці «Тэхналогія пластычных мас». Падчас вучобы ён пачаў удзельнічаць у спектаклях, яго заўважылі і прапанавалі паспрабаваць свае сілы на акцёрскай ніве. Мягкоў скарыстаўся парадай — і ў 1965 годзе паступіў у школу-студыю МНАТ. Пасля завяршэння адукацыі ён быў прыняты ў трупу тэатра «Сучаснік».

Яго працу на сцэне тэатра заўважыў рэжысёр Элем Клімаў, які неўзабаве прапанаваў яму ролю Сяргея Часнакова ў сваёй трагікамедыі «Прыгоды зубнога ўрача».

Затым, у канцы 60-х — пачатку 70-х, рушылі ўслед вядучыя ролі ў фільмах, якія сталі вызначальнымі ў лёсе і творчасці акцёра. У 1969 выйшла карціна «Стары дом», у 1971-м — «Сярэбраныя трубы». Яшчэ праз год выйшлі «Гросмайстар» і «Нечаканы госць», а ў 1973-м акцёр выканаў ролю Уладзіміра Леніна ў фільме «Надзея».

У 1975 годзе на экраны выйшла знакамітая камедыя Эльдара Разанава «Іронія лёсу, альбо З лёгкай парай». Андрэй Мягкоў у ролі Жэні Лукашына зачараваў усю краіну і набыў фантастычную папулярнасць. Характэрна, што Разанаў не хацеў браць яго ў фільм з-за яго сур'ёзнага амплуа, але ўсё ж адважыўся — і не пралічыўся. Стужка стала абсалютным хітом ва ўсіх кутках СССР, а Мягкову за ролю Лукашына ў 1977 годзе далі Дзяржаўную прэмію СССР.

У 1977 годзе Мягкоў зняўся ў яшчэ адным фільме Разанава — «Службовы раман». Роля Анатоля Навасельцава таксама мела велізарны поспех у гледачоў, і акцёр разам з Алісай Фрэйндліх склалі цудоўны акцёрскі дуэт. У 1979 годзе за гэтую ролю яму ўручылі Дзяржаўную прэмію РСФСР імя братоў Васільевых. Пасля гэтага Мягкоў яшчэ некалькі разоў удзельнічаў у фільмах Разанава і з'явіўся ў камедыі «Гараж», а таксама ў драме «Жорсткі раманс».

У 1987 годзе Мягкоў застаўся працаваць з Алегам Яфрэмавым у навастварэным МНАТ імя Чэхава, дзе служыць да гэтага часу.

ШАШКІ

Выпуск № 67

У канцы чэрвеня 54 шашысты прынялі ўдзел у 31-м міжнародным турніры па шашках–100 — «Мінск–2018». Пераможцам з вынікам 14 ачкоў з 18 магчымых стаў майстар спорту Міхаіл Семянюк. Нягледзячы на маладосць — Міхаіл толькі ў гэтым годзе скончыў школу — ён ужо мае высокае званне міжнароднага гросмайстра па шашках-64. Другім фінішаваў міжнародны майстар Аляксей Куніца — 13 ачкоў. Трэцяе месца яшчэ ў аднаго мінскага майстра Андрэя Моўчана — 12 ачкоў. На чацвёртым месцы з 12 ачкамі — кандыдат у майстры Вікторыя Нікалаева, што прынесла ёй перамогу ў жаночым заліку.

Паглядзіце цікавыя фрагменты гульні.

№ 44. А. Куніца — Я. Якубовіч.

Белыя простыя шашкі: 25, 27, 28, 30, 32, 33, 35, 36, 37, 38, 39, 40, 45 (13).

Чорныя простыя шашкі: 2, 8, 9, 10, 12, 13, 14, 16, 18, 19, 23, 24, 26 (13).

Белыя правялі «каралеўскі ўдар» і прарваліся ў дамкі 35. 27-22 18x27 36. 32x21 23x34

37. 40x20 16x27 38. 20-15 +

№ 45. Д. Нікіфарава — Я. Жукоўскі.

Белыя простыя шашкі: 24, 29, 33, 34, 36, 37, 38, 40, 43, 44, 45, 47, 49 (13).

Чорныя простыя шашкі: 2, 3, 4, 7, 8, 9, 14, 15, 16, 20, 25, 26, 27 (13).

Белыя правялі ўдар «масток» з прарывам у дамкі. Пакажыце яго.

Для самастойнага рашэння ў шашкі-64 прапануюцца кампазіцыі ўкраінскага шашачнага кампазітара Міхаіла Левандоўскага.

№ 46

Белыя простыя шашкі: a3, c1, e1, e3, f4, g7, h4 (7)

Чорныя простыя шашкі: a5, b4, b6, b8, c3, c5, c7, e7, h6 (9)

№ 46



№ 47

Белыя простыя шашкі: a1, a3, e1, e3, f2, g3, g5, h4 (8)

Чорныя простыя шашкі: b6, c5, c7, d4, d8, e7, g7, h6 (8)

Белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: Выпуск № 66 ад 29.06.18.

№ 41. f2. de5. g3. e1. a5 (g5) c3 (f4 VP-01) f2 (c7) d2 (d4) h6 (c3) fe3 (b2) g7 (c1) h6 (g5) b8+

VP-1: (c7) f2 (f4) d2.+

№ 42. fg7 (h8:d4a) f6. g3. g5. d2. +

№ 43. d8 (g5) a5. c5. a1+

Правільныя адказы даслалі В. Дударэвіч (в. Новая Мыш, Баранавіцкага р-на), Ф. Карпей (Мядзел), В. Статкевіч (п. Зялёны Бор, Івацэвіцкі р-н), В. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н), В. Бандарык (Мінскі р-н).

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда»; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ Сядзі і глядзі

АДНЫМ СЛОВАМ

«ЗЕМЛЕТРАСЕННЕ»

«TV1000 Рускае кіно», 17—18, 21—22 ліпеня

Чатырохсерыйны фільм сумеснай вытворчасці Расіі і Арменіі — спроба дакладна расказаць сучаснаму пакаленню пра страшэннае землетрасенне, якое адбылося ў Ленінакане 7 снежня 1988 года і забрала жыцці сама меней 25 тысяч чалавек.

Больш канкрэтна пра сумы. Сярэдні памер штомесячнай сацыяльнай дапамогі склаў 43,73 рубля на чалавека (за год ён вырас на 26 працэнтаў), аднаразовай — 138,73, кампенсацыі затрат на набыццё падгузкаў — 280 рублёў. Набор прадуктаў харчавання для дзяцей да двух гадоў каштаваў 61,73 рубля.

У асноўным сацыяльныя дапамогі выплачваюць шматдзетным і няпоўным сем'ям, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей, — 61,7 % з ліку атрымальнікаў. Сярод сем'яў, якіх забяспечваюць прадуктамі харчавання, таксама лідзіруюць шматдзетныя — амаль 44 %.

У сістэму стандартаў уваходзяць і дапамогі ў сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей. Нагадаем толькі некаторыя з іх. Памер штомесячных выплат па доглядзе за дзіцем устанаўліваецца зыходзячы з сярэднямесячнага заробку ў краіне за другі і чацвёрты кварталы. На першага малога дапамога складае 312 рублёў, на другога і наступных — 356. Выплаты ў сувязі з нараджэннем дзіцяці больш істотныя. За першынца маці належыць 10 бюджэтаў пражытковага мінімуму (ці крыху больш за дзве тысячы рублёў), за наступных — 14 БПМ (ці амаль 2,9 тысячы).

Ацаніць працу кожнага

Дзяржаўны гарант у сферы аплаты працы — гэта мінімальны заробак. Цяпер гэта сума ў 305 рублёў — столькі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

належыць тым, хто заняты на поўную стаўку і добрасумленна выконвае абавязкі. Калі палучка работніка не дацягвае да стандарту, наймальнік абавязаны яму даплаціць.

Сума невялікая. Яна, вядома, перавышае бюджэт пражытковага мінімуму, але не пакрывае мінімальнага спажывецкага бюджэту (гэта расходы на тавары і паслугі для задавальнення асноўных патрэб чалавека), які для працаздольнага насельніцтва складае каля 437 рублёў. З іншага боку, тыя, хто заняты на нізкааплатных работах без кваліфікацыі, могуць быць упэўненыя, што хоць бы столькі яны за сваю працу атрымаюць.

«Мінімалку» звычайна пералічваюць на пачатку кожнага года. Яна індэксуецца з улікам узроўню інфляцыі. Напрыклад, два гады таму мінімальны заробак раўняўся 240 рублям.

Дзяржава ўстанаўлівае таксама тарыфы аплаты працы. З іх дапамогай рэгулююцца заробкі ў бюджэтнай сферы. Адзіная тарыфная сетка ўлічвае розныя фактары і дазваляе атрымліваць больш тым спецыялістам, у каго вышэйшая кваліфікацыя, больш абавязкаў, вялікая фізічная ці інтэлектуальная нагрузка.

Што чакаць на пенсіі

Калі казаць пра пенсіі, то ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне розныя іх віды атрымліваюць больш за 2,5 мільёна чалавек. На працоўную пенсію па ўзросце цяпер маюць права жанчыны пасля 56 гадоў і мужчыны пасля 61. Агульны стаж работы для гэтага павінен складаць мінімум 20 і 25 гадоў адпаведна, а страхавы — 16 гадоў і 6 месяцаў. Для ўразлівых катэгорый планка іншая: бацькам дзяцей-інвалідаў, маці пяцярых дзяцей, інвалідам з дзяцінства дастаткова пяці гадоў страхавога стажу.

> Каб забяспечыць даступнасць паслуг для сельскіх жыхароў, пашыраецца сетка сацыяльных пунктаў і філіялаў цэнтраў — сёння іх налічваецца каля 1,2 тысячы.

Мінімальны памер працоўнай пенсіі на сёння — 191,03 рубля. Тым, хто дасягнуў 75 і 80 гадоў, устаноўлены даплаты — 38,73 і 51,65 рубля адпаведна. Сярэдні памер пенсіі па ўзросце цяпер складае 340,53 рубля.

А што, калі патрэбны стаж не ўдалося напрацаваць? У такім выпадку пажылых забяспечваюць сацыяльнымі пенсіямі, праўда, выплачваць іх пачынаюць пазней — жанчынам пасля 60 гадоў, мужчынам пасля 65. І памер меншы —103 рублі (для інвалідаў сумы вышэйшыя).

Каб падтрымаць уразлівыя катэгорыі, выплачваюць таксама пенсіі па страце карміцеля, па інваліднасці.

Памер працоўных пенсій карэктуецца мінімум раз на год — у сувязі з ростам сярэдняга заробку па краіне. Мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, дабаўкі і павышэнні да іх, даплаты пажылым пасля 75 гадоў пераглядаюцца разам са змяненнем бюджэту пражытковага мінімуму.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Дзіцячы садок для састарэлых, школьны аўтобус для гараджан і еўрадровы па заяўцы

Што робіць жыццё ў аграгарадку яшчэ больш прывабным? Аб гэтым даведаліся ўдзельнікі семінара, што прайшоў у Віцебскім раёне. На яго запрасілі абраннікаў, старшынь Саветаў дэпутатаў першаснага ўзроўню, якія абмяркоўвалі работу органаў мясцовага кіравання і самакіравання па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. І ў выкананні сацыяльных стандартаў у раёне, а канкрэтна ў Варонаўскім сельсавеце, многае зроблена. Тут можна многаму навучыцца. Напрыклад, вопыту бездатацыйнай работы, аказанню паслуг насельніцтву, добраўпарадкаванню тэрыторый...

НАВАСЕЛЛІ НА БЫЛЫМ ПОЛІ

Напачатку ўдзельнікам семінара паказалі катэджы, дзе справілі навасяленні мясцовыя жыхары і грамадзяне, якія купілі зямлю пад будаўніцтва на аўкцыёнах.

Віктар ДАРОЖКІН, старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў, і Юрый Восіпаў, старшыня Варонаўскага сельсавета расказалі пра квартал індывідуальнай забудовы. Раней тут было поле. Мясцовая ўлада некалькі гадоў таму прыняла рашэнне выкарыстаць гэтую зямлю пад будаўніцтва жылля. Прыярытэт, канешне, быў аддадзены вяскоўцам, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. І пяцьдзясят сем'яў атрымалі права зрабіць гэта. Яшчэ больш за трыццаць участкаў прадалі з малатка. Попыт быў вялікі, бо недалёка Віцебск, ды і аграрны гарадок Вароны вельмі ўтульны для пражывання. Тут ёсць усе выгоды.

Наогул, тут з'явілася добрая тэндэнцыя: насельніцтва ў Варонах павялічваецца. Калі ў 2010-м у аграгарадку было каля 580 жыхароў, цяпер тут жывуць пад 760 чалавек. Ствараюцца сем'і, нараджаюцца дзеці, вёска жыве.

Цікава, што ў школу, дзе навучаецца каля 120 школьнікаў, ходзяць таксама дзеці з Лёзненскага раёна. І нават з Віцебска! Апошняе трохі здзіўляе. Як высветлілася, у новым спальным раёне абласнога цэнтра існуе праблема з тым, каб стаць вучнем школы ў «крокавай даступнасці». А да Варон некалькі кіламетраў, ды і школьны аўтобус з гарадка праязджае праз горад...

БЕЗ ПРАБЛЕМ З РАЗМЯШЧЭННЕМ

А ў Варонаўскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў расказалі пра тое, як годна можна жыць у дзяржаўнай установе сацыяльнага абслугоўвання. У пакоях — па адным або два чалавекі. Ёсць магчымасць не горш, чым у краінах ЕС, прайсці курсы рэабілітацыі, рэлаксацыі і гэтак далей. Напрыклад, ёсць блок водных працэдур.

Нярэдка, дзякуючы клопату персаналу, тыя, хто былі прыкаваныя да ложка, пачынаюць самастойна выязджаць на каляска х на вуліцу і нават хадзіць. Працягласць жыцця ў інтэрнаце большая ў параўнанні з той, што ў састарэлых, якія жывуць дома.

Зімой тут ахвотна часова знаходзяцца тыя, у каго сваякі далёка або іх няма зусім. Можна пабыць і дзень, бо аказваецца адпаведная паслуга. Яна вядомая як «Дзіцячы садок для састарэлых».

Аналагічная практыка і ў іншых установах Віцебшчыны. Праблем з размяшчэннем тых, хто пажадае, у інтэрнаты няма ва ўсёй вобласці.

Дэпутатам расказалі пра тое, што зроблена для добраўпарадкавання тэрыторыі. Такое не сорамна паказаць іншаземцам. Ды ім, дарэчы, тут могуць даць майстар-клас таго, як пры параўнальна невялікіх выдатках, але з фантазіяй зрабіць цуд.

КУП ПРАЦУЕ І НА ЭКСПАРТ

Пра камунальнае ўнітарнае прадпрыемства па аказанні паслуг «Вароны-сэрвіс» мы ўжо пісалі ў «МС». Нагадаю, тут, у прыватнасці, напрацавалі добры вопыт у знішчэнні баршчэўніку, наводзяць ідэальны парадак на вясковых могілках, ёсць іншыя кірункі дзейнасці.

Дэпутаты ўзялі «на карандаш» адпаведныя напрацоўкі. Для іх арганізавалі агляд тэхнікі, якая выкарыстоўваецца для аказання паслуг насельніцтву.

Усё больш заказчыкаў у КУП на так званыя еўрадровы: 1,6 куба акуратна складзенага драўлянага паліва прывязуць таму, хто мае патрэбу, акуратна складуць. Потым, як мовяць, толькі бяры і спальвай... У прадпрыемства ёсць свая піларама. Драўніну экспартуюць у краіны Прыбалтыкі і Галандыю.

Дарэчы, як канстатаваў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ,** такая плённая дзейнасць КУП — прыклад таго, што пры жаданні можна аказваць не толькі паслугі па сацыяльных расцэнках. Калі правільна арганізаваць дзейнасць, можна канкураваць з недзяржаўнымі структурамі, працаваць з прыбыткам.

Ён станоўча ацаніў тое, што робіцца мясцовай уладай, у тым ліку і ў пытаннях выканання сацыяльных стандартаў, работы з насельніцтвам.

— Поспех у тым, што ў раёне дасведчаныя кадры, плюс наладжанае эфектыўнае ўзаемадзеянне паміж галінамі ўлады і дзяржаўнымі ўстановамі... Зразумела, што раён — «уязныя вароты» ў Віцебск, і таму павінен з'яўляцца ўзорным, — адзначыў старшыня.

Ён стаў ініцыятарам таго, каб семінары па розных тэмах праводзіліся ў рэгіёнах, асобна ўзятых сельсаветах, дзе ёсць чаму павучыцца. Трэба толькі прыехаць, паглядзець на ўласныя вочы і ўзяць на ўзбраенне адпрацаванае на практыцы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЯК АТРЫМАЦЬ «ПРАВІЛЬНУЮ» ВАДУ?

Якасць жыцця залежыць ад розных фактараў, у ліку якіх і водазабеспячэнне

Многія сельскія жыхары занепакоены станам пітной вады. Аб гэтым сведчаць шматлікія звароты ў розныя інстанцыі. І работа ў гэтым кірунку вядзецца. На ўзроўні абласных улад зацверджаны праграмы добраўпарадкавання аграгарадкоў з улікам паляпшэння водазабеспячэння. Разам з тым выяўлена нямала фактаў неналежнай эксплуатацыі такіх аб'ектаў. У выніку пагаршаецца якасць вады, а нярэдка гэта прыводзіць і да аварыйных сітуацый.

Каб станцыі не выходзілі са строю

Санітарныя службы ажыццяўляюць пастаянны кантроль за якасцю вады. Як паказалі праверкі, мікрабіялагічныя паказчыкі нават ніжэйшыя за норму, што забяспечвае санітарна-біялагічную бяспеку. А вось па хімічным стане ёсць пытанні. Асабліва многа скаргаў ад насельніцтва на ржавую ваду. Як растлумачыў **намеснік галоўнага санітарнага ўрача Гродзенскай вобласці Аляксандр РУФКІН,** прыродная вада сама па сабе змяшчае жалеза, а пасля праходжання праз водаправоды ўтрыманне гэтага рэчыва яшчэ больш узрастае.

Палепшыць стан вады дапамагаюць станцыі абезжалезвання. Дзякуючы ім, за дзесяць гадоў у два разы знізіўся хімічны парог проб. У сельскай мясцовасці працуе 68 такіх станцый, яшчэ 58 запланавана пабудаваць на Гродзеншчыне да 2020 года. Кожны год уводзіцца ў строй 5-6 аб'ектаў.

Найбольш прыкра, што шэраг новых станцый не працуе. Сёлета зафіксавана восем аб'ектаў, якія выйшлі са строю. Удалося адрамантаваць палову, астатнія пакуль спынілі падачу вады, гэта значыць, што насельніцтву зноў паступае такая ж іржавая вада.

Не ўсе ўласнікі аб'ектаў сістэм пітнога водазабеспячэння (а гэта сельгаспрадпрыемствы і ЖКГ) належным чынам іх абслугоўваюць. Па словах Аляксандра Руфкіна, было абследавана амаль 640 водаправодаў — пітных і гаспадарчых. Санітарна-эпідэміялагічныя парушэнні ўстаноўлены на большасці камунальных і амаль на ўсіх ведамасных аб'ектах.

Занядбанымі можна назваць некалькі дзясяткаў свідравін. Хоць яны перададзены на баланс ЖКГ, парадак на іх так і не наведзены. Як санітарныя, так і тэхналагічныя нарматывы не выконваюцца.

У камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выявілі праблемы з улікам вады на свідравінах, парушэнні правілаў эксплуатацыі пасялковых ачышчальных збудаванняў. Не ўсе прадпрыемствы маюць дазвол на карыстанне свідравінамі. Адсутнасць такога спецыяльнага дазволу цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць. І такія справы разглядаліся з удзелам пракуратуры. Але пакуль 30 суб'ектаў гаспадарання з 450 карыстаюцца свідравінамі самавольна.

Далучыць да праблем мясцовыя ўлады

У Камітэце дзяржкантролю Гродзенскай вобласці агучылі такі факт: кожны трэці метр водаправода ў сельскай мясцовасці працуе больш за 30 гадоў. Сеткі даволі зношаныя, але не толькі яны. Маніторынг выявіў нездавальняючы стан аб'ектаў водазабеспячэння — свідравін, ачышчальных збудаванняў.

Як зазначыў **старшыня КДК Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА,** такі стан уплывае і на якасць вады, і на эканоміку. З-за гэтага летась у 10 раёнах адбыліся значныя страты вады, а ў некаторых яны даходзілі да 27 %. Зафіксавана амаль 80 аварый. Большасць з іх адбылася ў Смаргонскім, Дзятлаўскім, Карэліцкім, Зэльвенскім, Ваўкавыскім раёнах. На ліквідацыю аварый уласнікі трацяць значныя сродкі. Пры гэтым праграмы па замене зношаных сетак не існуе, работы вядуцца хаатычна. На думку Анатоля Дарожкі, трэба распрацаваць мерапрыемствы па замене водаправодаў у сельскіх населеных пунктах вобласці і на гэтыя мэты выдзяляць неабходныя сродкі. Пад канкрэтныя аб'екты — канкрэтнае фінансаванне. Гэту работу неабходна праводзіць з удзелам мясцовых улад — райвыканкамаў і сельскіх Саветаў, якія зацвердзілі б комплекс мерапрыемстваў па паляпшэнні сітуацыі.

Накіроўваць сродкі па прызначэнні

Генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання ЖКГ Гродзенскай вобласці Алег ШАФРАНСКІ растлумачыў: у камунальнікаў ёсць магчымасць палепшыць сітуацыю ўласнымі сіламі. Прыток фінансаў забяспечваюць высокія тарыфы за ваду. У вобласці насельніцтва плаціць за кубаметр вады 80 капеек, не хапае толькі чатырох капеек, каб поўнасцю «пагасіць» субсідыі. Але і гэта хутка адбудзецца. У згаданай цане прадугледжаны і адлічэнні за амартызацыю. У год яны складаюць амаль 10 мільёнаў рублёў. Такіх сродкаў магло б хапіць на перакладку 10 % водаправодаў. Але грошы не заўсёды ідуць на ўзнаўленне аб'ектаў, бо іх накіроўваюць на іншыя патрэбы. Напрыклад, у Карэліцкім раёне, дзе высокая аварыйнасць сетак, атрымліваюць амаль 100 тысяч у год такіх адлічэнняў, а правесці замену старых участкаў не могуць. Такая сітуацыя недапушчальная, лічыць Алег Шафранскі.

На яго думку, пытанне трэба вырашаць на ўзроўні дзяржавы. Ён адзначыў, што ўжо распрацоўваецца праект указа па стварэнні амартызацыйнага фонду. У гэты фонд будуць паступаць сродкі, якія не былі выкарыстаны па прызначэнні, у тым ліку і па аднаўленні сістэмы водазабеспячэння. Калі гаспадары сетак не правядуць такія работы, сродкі за амартызацыю пяройдуць у агульны фонд. Вось тут і патрэбна дапамога дэпутатаў, якія ўлічвалі б гэты факт пры размеркаванні бюджэту і наогул на месцах далучыліся б да мерапрыемстваў па падрыхтоўцы абласной праграмы добраўпарадкавання аб'ектаў водазабеспячэння і водаадвядзення.

Пакасіць траву, пафарбаваць і пачысціць ад смецця...

Навесці парадак можна і без асаблівых затрат. Праверкі дзяржкантролю паказалі, что шэраг аб'ектаў знаходзіцца ў занядбаным стане. Абсталяванне водазаборных свідравін не пафарбавана, яго раз'ядае ржа, люкі пашкоджаны, на санітарных зонах пасецца жывёла, тэрыторыя зарастае бур'яном. Факты сведчаць пра тое, што за важнымі воднымі аб'ектамі не вядзецца кантроль, што і прыводзіць да падобнага стану. А гэтыя работы не патрабуюць нейкіх сродкаў, хутчэй увагі. Трэба толькі арганізаваць сістэмную работу: своечасова абкошваць тэрыторыю, убраць смецце, пачысціць ад пылу і адключыць ад сеткі электраабсталяванне. У дзяржкантролі лічаць, што дэпутаты таксама павінны сачыць за парадкам на такіх аб'ектах і ўплываць на падтрыманне іх у добрым стане.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

НОВЫЯ ФОРМЫ РАБОТЫ

ВЕСТКА З САЦЫЯЛЬНАГА ЛОЖКА,

або Як у Магілёўскім раёне ўдасканальваюць сацыяльныя стандарты

Яны, у прыватнасці, адзін цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва на раён, выконваецца ў Беларусі бездакорна, усе, хто мае патрэбу ў сацыяльным работніку, могуць разлічваць на яго дапамогу. Ветэраны вайны, малалетнія вязні абслугоўваюцца бясплатна. Маладыя маці, на выхаванні якіх знаходзяцца двайняты, трайняты, забяспечваюцца няняй. Няма чаргі на паслугі сацработнікаў і па іншых катэгорыях. Але самой службе трэба пастаянна шукаць новыя спосабы, каб яшчэ больш пашырыць спектр паслуг, зрабіць жыццё найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва камфортным і якасным. Каб гэтыя людзі не адчувалі сябе нікому не патрэбнымі.

Вольга ЕРМАКОВА, Інэса ЧЭКСТЭРС, Таццяна ПУЗЫРЭЎСКАЯ *(злева направа)* дэманструюць новую паслугу.

Мабільная паслуга

Апошняя з распрацовак тутэйшага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва — «Жывы ліст у родны дом». **Намеснік дырэктара цэнтра Інэса ЧЭКСТЭРС** расказала, што на гэтую ідэю яе натхнілі пошукі ў інтэрнэце новых формаў работы з насельніцтвам. Не ўсе «навінкі» карыстаюцца поспехам, а гэта прыжылася. Яе карыстальнікі — пацыенты ўчастковых бальніц, якія месяцамі і нават гадамі жывуць на сацыяльных ложках і амаль цалкам страчваюць сувязь з родным домам.

— На тэрыторыі Магілёўскага раёна 15 сельскіх саветаў, 11 сацыяльных пунктаў, чатыры бальніцы сястрынскага догляду — у Княжыцах, Сухарах, Дашкаўцы і Нядашаве. Там ёсць медыка-сацыяльныя ложкі, дзе ляжаць адзінокія, інваліды, састарэлыя, — расказвае **дырэктар Магілёўскага раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Таццяна ПУЗЫРЭЎСКАЯ**. — Адна жанчына, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, знаходзіцца ў Сухарэўскай бальніцы больш за 10 гадоў. Ужо і родных у яе не засталося. Але ў дом-інтэрнат адмаўляецца ісці. Як і многія іншыя. Так бліжэй да дому і ў бальніцы прасцей сустрэць сваіх землякоў. Ахвотных трапіць на гэтыя ложкі болей чым дастаткова — каля 100 пры плане 60.

Прынцып дзеяння новай паслугі вельмі просты. Спачатку сацыяльны работнік запісвае на мабільны тэлефон відэапрывітанне ад пацыента, а потым «перакідвае» яго свайму калегу па месцы прызначэння. Той, у сваю чаргу, рыхтуе адказ. У старых часцей за ўсё, мабільнікаў няма, і такая дапамога ім вельмі дарэчы.

На жаль, магчымасці мінімальныя. Экран мабільнага тэлефона не вельмі вялікі, а ў старых не той зрок, каб нешта там добра разглядзець. Іншая справа — планшэты, але ж дзе іх узяць? Адны спадзяванні на спонсараў. Больш мабільнымі зрабіць сацыяльных работнікаў маглі б і скутары. У Магілёўскім раёне 265 населеных пунктаў, дзе жыве каля 40 тысяч чалавек. І прыкладна чацвёртая частка з іх — пенсіянеры, непасрэдныя карыстальнікі паслуг цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, каб дайсці да кожнага трэба шмат часу і сіл. У цэнтры былі б вельмі ўдзячны за дапамогу мабільнымі сродкамі сувязі. Пакуль прыходзіцца спадзявацца толькі на свае ногі або ў лепшым выпадку на веласіпед.

Віртуальныя сустрэчы

У Княжыцкім сельсавеце ўкараненнем новай паслугі займаецца **спецыяліст па сацыяльнай рабоце Таццяна ТАМАХОВА**. Першай яе кліенткай стала 83-гадовая Ніна Самкова. Жанчына ўжо некалькі гадоў правяла на сацыяльным ложку, не ведае, што сталася з яе домам, чым жывуць суседзі. Вёска аддаленая і маланаселеная. Спачатку жанчына ездзіла дадому на лета, а зараз сіл на гэта няма. Дзеці яе ўжо памерлі. Толькі і радасці засталося — пагутарыць з суседкай. Віртуальна.

— Прывет табе вялікі, жадаю табе моцнага здароўя, — перадала яна відэапасланне сваёй сяброўцы па вёсцы Марыі Бондаравай. Спыталася, як там яе дом, якія наогул навіны. У канцы зрывістым ад хвалявання голасам дадала: «Можа яшчэ сустрэнемся... Вельмі б гэтага хацелася».

Такіх кранальных відэасюжэтаў у скарбонцы цэнтра сацыяльнага абслугоўвання ўжо некалькі. Глядзець іх без слёз немагчыма. Столькі горычы ў словах старых людзей, столькі схаванай надзеі ў няўпэўненых выказваннях аб сустрэчы, як балюча сумуюць яны па родных сценах, па звыклых месцах, аднавяскоўцах.



Ніна САМКОВА перадае прывітанне.

— Летась мы запісалі зварот Марыі Раманаўны Ільюшынай з вёскі Прокшанічы да яе прыяцелькі Надзеі Самалазавай, яны так спадзяваліся сустрэцца вясной, пагутарыць пра ўсё. Наша падапечная — шматдзетная маці, вырасціла чацвярых дзяцей, але ў старасці месца ў дамах яе сыноў і дачок не знайшлося. Засталася адна. Радавалася вестцы ад сяброўкі, але ні тая, ні другая вясны не дачакаліся — памерлі. А запіс вось застаўся, — уздыхае дырэктар цэнтра сацыяльнага абслугоўвання.

Дайсці да кожнага

Ёсць і іншыя паслугі, якія ўкаранілі тутэйшыя сацыяльныя работнікі. Напрыклад, «санаторый дома». Для аздараўленчых працэдур былі закуплены спецыяльныя прыстасаванні. Сацработнік можа нават іх і дадому прынесці. А яшчэ тут вырошчваюць кветкі, якія потым сушаць і робяць лячэбную гарбату. На розных фестывалях арганізоўваюць дэгустацыю гэтых напояў. Нядаўна частавалі народ на Купаллі ў Александрыі. І некаторыя ахвотна куплялі травяныя зборы. Для цэнтра гэта і капейка на развіццё, і клопат пра тых людзей, якіх ён абслугоўвае. Самі падапечныя шыюць, вяжуць, плятуць кошыкі, робяць дамскія аксесуары і сувеніры. Даход ад гэтага невялікі, але пенсіянерам падабаецца. Яны адчуваюць сябе патрэбнымі.

— Сацыяльныя стандарты прапісаны, а вось формы — не. Мы шукаем іх самі, потым абменьваемся на семінарах, калегіях, — кажа Таццяна Пузырэўская. — Каму трэба, той пераймае. Не ўсюды ўсё яшчэ прыжывецца.

Але ёсць паслугі, дзе ўсё распісана да дробязяў на заканадаўчым узроўні. У прыватнасці, цэлы пералік умоў існуе па крызісным пакоі, дзе жывуць людзі, якія перанеслі гвалт. Гэты пакой таксама на ўзбраенні сацыяльнай службы. Да паслуг пацярпелых — аднапакаёўка з мэбляй, кухняй і цэлым наборам бытавой тэхнікі. Чалавек знаходзіцца там, пакуль крызісная сітуацыя ў яго сям'і не вырашыцца. Нядаўна там жыла бабуля, з якой здзекаваўся сын. Пасля таго як ён трапіў пад крымінальную адказнасць і быў арыштаваны, жанчына вярнулася дадому. Зараз там часова «прапісалася» маладая маці, якая пакутавала ад жорсткіх дзеянняў свайго мужа. Міліцыя зрабіла для яе абаронныя прадпісанні, а яе мучыцель хутка сядзе за краты. Апошнім часам меры да такіх людзей сталі больш жорсткімі.

Яшчэ адна катэгорыя, пра якую трэба клапаціцца, — бамжы. У іх ні грошай, ні пашпартоў. Каб яны атрымалі від на жыхарства, прыходзіцца клапаціцца сацыяльным работнікам. Яны звяртаюцца ў пашпартна-візавую службу, падрыхтоўваюць для іх медыцынскія даведкі. Усе гэтыя паслугі нятанныя, але выдаткі на іх не прадугледжаны.

— Штогод да нас звяртаецца па некалькі такіх чалавек. Як ім дапамагчы, невядома, — паціскае плячыма **загадчыца аддзела першаснага прыёму, інфармацыі, аналізу і прагназавання Магілёўскага раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Вольга ЕРМАКОВА.** — Спонсары адмаўляюцца. Дапамагаюць хворым дзецям, абяздоленым, а гэтым — не. Кажуць, яны ўсё жыццё пілі і гулялі, чаму мы ім будзем дапамагаць. Мы ў тупіку. Вось для каго не існуе ніякіх стандартаў. Але ж такія людзі ёсць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 442/С-5893 (назначение – здание специализированное культурно-просветительского и зрелищного назначения, наименование – сельский дом культуры), общей площадью 772,2 кв. м, расположенное по адресу: Островецкий р-н, Ворнянский с/с, д. Гоза

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 424680405600000003, площадью 0,4169 га (назначение – земельный участок для размещения объектов культурно-просветительского и зрелищного назначения (обслуживания Гозянского сельского клуба) по адресу: Островецкий р-н, Ворнянский с/с, д. Гоза. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежный полос, код – 2, площадью 0,4169 га

Начальная цена продажи – 53 040 руб. (пятьдесят три тысячи сорок рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 5 300 руб. (пять тысяч триста рублей)

Продавец – Совместное общество с ограниченной ответственностью «СМУ Союзтелефонстрой», 220090, г. Минск, ул. Восточная, 169, Тел. 8 017 293-34-16, факс 8-017-293-34-02

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 17 августа 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 13 августа 2018 г. до 15.00

Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Миноблавтотранс» филиал «Автобусный парк № 4» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

здание щитового домика № 1, инв. № 631/С-12270, общ. пл. 53,0 кв. м;

здание щитового домика № 2, инв. № 631/С-12261, общ. пл. 154,7 кв. м;

здание щитового домика № 3, инв. № 631/С-12266, общ. пл. 72,1 кв. м;

здание щитового домика № 4, инв. № 631/С-12265, общ. пл. 74,1 кв. м;

здание щитового домика № 5, инв. № 631/С-12264, общ. пл. 114,1 кв. м;

здание щитового домика № 6, инв. № 631/С-12268, общ. пл. 70,9 кв. м;

здание щитового домика № 7, инв. № 631/С-12269, общ. пл. 55,4 кв. м;

здание щитового домика № 8, инв. № 631/С-12263, общ. пл. 82,3 кв. м;

здание склада, инв. № 631/С-12272, общ. пл. 86,7 кв. м;

здание столовой с пристройкой (в состав объекта входят: здание столовой с пристройкой (К 1/к), 2 уборные (литеры 1 и 2), умывальник (литер 3), эл. щитовая (литер 4), навес (литер 5));

здание склада (пристройки), инв. № 631/С-12273, общ. пл. 30, кв. м;

здание бани, инв. № 631/С-12267, общ. пл. 103,2 кв. м;

здание спального корпуса на 150 мест и 10 беседок, инв. № 631/С-12262, общ. пл. 2026 кв. м (в состав объекта входят: здание спального корпуса на 150 мест (литер 3 2/к), 10 беседок (литеры 1-10);

ограждение металлическое, инв. № по бух. учету 10072.

Указанное имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 621385402101000003 площадью 6,6419 га по адресу: Минская обл., Вилейский р-н., Осиповичский с/с, д. Доманово.

На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: водоохранная зона р. Вилия (6,6419 га), охранная зона кабеля связи (0,1226 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – 58 012,60 бел. руб. ***(цена снижена на 80 %).***

Установлены типовые условия продажи объектов.

Задаток – 10 % от начальной цены (5 801,00 бел. руб.) перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течении 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона. Предыдущее извещение о проведения торгов опубликовано в газете «Звязда» от 11.01.2018 г. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **31.07.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.07.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

ДА МЁДУ ГАТОВЫЯ?

Аляксандр Мушыц заняўся пчалярствам дзясятак гадоў таму. Цяпер у яго качавы пчальнік, з якім ён пераязджае пры беднасці меданосаў, і каля паўсотні пчоласем'яў. Карэспандэнт газеты «Навіны Камянеччыны» завітаў да яго і спытаў, які «ўраджай» можна чакаць сёлета.

Пачынаў пчаляр з аднаго вулля ў Голым Барку, дзе жывуць яго бацькі. Сёння Аляксандр не толькі даглядае пчол, але і майструе вуллі, абсталёўвае перасоўныя платформы (іх пакуль што дзве). Гаспадар упэўнены, што гэтым летам давядзецца яшчэ не раз «пераехаць», каб пчолы змаглі падрыхтаваць запас і сабе да зімы, і для медагонкі. Зараз на грэцкім полі, дзе стаяць платформы Аляксандра, працуюць каля ста пчаліных сем'яў. Нават з Пружаншчыны даставілі сюды платформу з вуллямі. На іншым грэцкім — каля 300. Пры спрыяльных умовах адна сям'я можа даць да 80 кілаграмаў мёду. Але, на жаль, сёлета на такі ўраджай разлічваць не прыходзіцца.

ЗРУЧНА ДЛЯ КОЖНАГА

«Светлагорскія навіны» расказваюць, як у раёне выконваецца праграма па стварэнні безбар'ернага асяроддзя. Ужо выканана работа на 17 аб'ектах сацыяльнай інфраструктуры. А зараз па заяўным прынцыпе запланавана зрабіць больш даступнымі яшчэ два аб'екты жыллёвага фонду: там збіраюцца ўстанавіць поручні.

Пяць уваходаў у пад'езд, дзе пражываюць інваліды-калясачнікі, ужо абсталяваны пандусамі, пры гэтым устанавілі 30 поручняў. На гэта выдаткавана больш за 2,5 тысячы рублёў бюджэтных сродкаў. А на выкананне адпаведнай дзяржпраграмы за кошт усіх крыніц фінансавання ў Светлагорску і раёне затрачана звыш 12 тысяч рублёў. У першым паўгоддзі стварылі шэсць пешаходных пераходаў з паніжаным бартавым каменем. У апошні час пачасціліся звароты грамадзян наконт адкідных пандусаў у пад'ездах шматкватэрных жылых дамоў. На жаль, большасць дамоў жыллёвага фонду Светлагорска былі пабудаваныя без уліку асаблівасцяў безбар'ернага асяроддзя. Устаноўка пандусаў у існуючай забудове прыраўноўваецца да мадэрнізацыі і павінна весціся па дзеючых будаўнічых нормах.

ГАЛОЎНАЕ — СУМЛЕННАСЦЬ

Імя старшай медыцынскай сястры тэрапеўтычнага аддзялення № 1 Свіслацкай цэнтральнай раённай бальніцы Наталлі ЯРМОЛІК упрыгожвае раённую Дошку гонару. Карэспандэнт «Свіслацкай газеты» распытаў медсястру, якая працуе ў гэтай бальніцы без малога 30 гадоў, што галоўнае ў людзях і працы.

Пачынала Наталля працаваць у Гродне, у тагачаснай медыка-санітарнай частцы «Гродна Азот». Там сустрэла будучага мужа, з якім і прыехала ў ціхае невялікае мястэчка побач з Белавежскай пушчай. Свежае паветра, добразычлівыя людзі, тутэйшыя традыцыі падкупілі Наталлю: праз некаторы час яна зразумела, што далейшае яе жыццё пройдзе ў Свіслачы. У гутарцы медсястра падзялілася, што больш за ўсё ў людзях цэніць сумленнасць. Гэтую якасць ёй у дзяцінстве прывілі бацькі, а яна ў сваю чаргу ў гэтым рэчышчы выхоўвала сваіх дзяцей — дачку Алесю і сына Мікіту.

Наталля працуе ў калектыве з 29 чалавек. Тэрапеўтычнае аддзяленне налічвае 60 ложкаў, з іх 20 — сястрынскага догляду. Пацыенты, якія іх займаюць, — людзі сталага ўзросту і патрабуюць асаблівай увагі.

СВАЁ ЖЫЛЛЁ ЗА ТРЫ МЕСЯЦЫ

Дамы са Шклоўскага завода газетнай паперы ўжо вядомы ў Францыі: там пабудавана цэлая вуліца і на падыходзе — яшчэ квартал. Апошнім часам імі зацікавіліся партнёры з Чэхіі, Літвы, Польшчы і Расіі. Карэспандэнт раённай газеты «Ударны фронт» завітаў на прадпрыемства, каб паглядзець, як яны будуюцца.

shklovinfo.by.

Перш чым прыступіць да вытворчасці каркасна-панэльнага дома, аб'ект мадэлюецца ў маштабе 1:1. У праграме прамалёўваюцца каркас, элементы мацавання. Пасля распрацоўкі аптымізуюцца піламатэрыялы, з якіх будуць вырабляцца элементы панэляў, каб мінімізаваць адходы вытворчасці (паказчык адходаў не перавышае 2,5 % на ўвесь дом).

«На дадзены момант канструктарскім аддзелам «Домабудавання» выканана каля 980 праектаў дамоў, — расказвае **начальнік канструктарскага аддзела філіяла «Домабудаванне» завода газетнай паперы Ігар ЮРКАВЕЦ.** — З тыпавых найбольшым попытам карыстаюцца такія, як «Вясёлка», «Александрыя». Але большасць заказаў індывідуальныя. Праектуем мы хутка, заўсёды цікава працаваць, калі робіш нешта новае».

Каркасна-панэльны дом можна ўзвесці ўсяго за тры месяцы ў любую пару года. Тэрмін эксплуатацыі дома з поўным выкананнем тэхналогіі будаўніцтва складае 30—50 гадоў.

Надзея АНІСОВІЧ.

ІНФРАСТРУКТУРА

СЭРВІС ДЛЯ ПЕРАВОЗЧЫКА

Транспартна-лагістычны цэнтр на мяжы з Літвой распачне работу ў жніўні

Будаўніцтва ідзе побач з пунктам пропуску «Каменны Лог». Гэта самы ажыўлены напрамак, які вядзе ў Літву. Сведчаннем таму і вялікія чэргі грузавікоў, якія нярэдка дасягаюць некалькіх кіламетраў. І хоць за суткі праязджае каля адной тысячы машын, праблема чэргаў застаецца. Новы аб'ект дазволіць стварыць кіроўцам больш камфортныя ўмовы на мяжы і паскорыць афармленне дакументаў.

Будаўніцтва транспартна-лагістычнага цэнтра пачалося мінулым летам. Зараз узведзена сэрвісная зона, завяршаецца будаўніцтва склада плошчай пяць тысяч квадратных метраў, а таксама стаянкі на 500 аўтамабіляў. Дарэчы, праект склада створаны з улікам усіх сусветных тэхналогій. Непадалёк пабудаваны і цеплавузел — уласная кацельная, якая будзе працаваць на мясцовым паліве — торфе. Агульны кошт інвестыцыйнага праекта — 20 мільёнаў рублёў.

Як паведаміў **начальнік упраўлення будаўніцтва і эксплуатацыі прадпрыемства «Белмытсэрвіс» Сяргей ВАСЮК,** праект знаходзіцца на канчатковай стадыі рэалізацыі, мантажна-будаўнічыя работы будуць поўнасцю завершаны ў ліпені, а ў жніўні лагістычны цэнтр пачне прымаць перавозчыкаў і грузы. Кіроўцы, якія стаяць уздоўж дарогі, змогуць заязджаць сюды, адзначыў Сяргей Васюк.

Тут будзе адкрыты ведамасны пункт мытнага афармлення. Тыя, хто пажадае паскорыць кантроль, змогуць падаць дакумент загадзя ў электронным выглядзе. Мяркуецца, што працэдура кантролю будзе даволі аператыўнай — усяго 15 хвілін.

Размеркаваць грузапаток вельмі важна, бо гэты напрамак — адзін з самых ажыўленых на літоўскім кірунку. Ажыццяўляецца перавалка мільёна тон грузаў у год. Транспартна-лагістычны цэнтр дапаможа зрабіць іх перавозку больш рацыянальнай і дасць гарантыю дастаўкі ў аптымальны тэрмін і па найбольш выгадным маршруце. Па прагнозах, гэта прыцягне дадатковыя транзітныя грузапатокі ў Беларусь для мытных аперацый, тэрміналнай апрацоўкі грузаў, якія накіроўваюцца ў нашу краіну, а таксама і да суседзяў па Еўразійскай эканамічнай прасторы.

Пляцоўкі вакол цэнтра зможа асвойваць прыватны бізнес. Ужо ёсць звароты ад прадпрымальнікаў, якія маюць намер размясціць тут свае аб'екты. Плануецца, што тут з'явяцца станцыі тэхабслугоўвання, запраўкі, мыйкі, банкаўскія прадстаўніцтвы, офісныя памяшканні і іншае.

У будаўніцтве лагістычнага цэнтра зацікаўлены і ўлады Ашмянскага раёна, на тэрыторыі якога ўзводзіцца аб'ект. Вялікія чэргі на трасе ствараюць пэўныя клопаты раёну. **Намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама Галіна ЛЮТКОЎСКАЯ** адзначыла, што пасля ўвядзення ў эксплуатацыю лагістычнага цэнтра кіроўцы атрымаюць неабходныя паслугі, у тым ліку бытавыя. Значны плюс для раёна — стварэнне 100 новых рабочых месцаў і паступленне падаткаў у бюджэт.

Дарэчы, у Гродзенскай вобласці транзітная прывабнасць і транспартна-лагістычны патэнцыял увайшлі ў склад прыярытэтных кірункаў дзейнасці. У канцы 2016 года з'явіўся першы ў рэспубліцы прыгранічны лагістычны цэнтр у пункце пропуску «Брузгі» на беларуска-польскай мяжы.

У найбліжэйшыя два гады яшчэ адзін транспартна-лагістычны цэнтр адкрыецца на мяжы з Польшчай — у пункце пропуску «Бераставіца».

Маргарыта УШКЕВІЧ.

У ТЭМУ

Налета ў пункце пропуску «Каменны Лог» пачнецца рэканструкцыя, у выніку якой агульная прапускная здольнасць павялічыцца ў шэсць разоў. У два разы ўзрасце прапускная здольнасць грузавых аўтамабіляў. Тут з'явіцца стацыянарны інспекцыйна-надглядны комплекс, пакуль ёсць толькі мабільны. Сумежны літоўскі пункт пропуску «Мядзінінкай» плануюць рэканструяваць у 2019—2021 гадах.

РЭГІЯНАЛЬНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ

МЕНШ ЧЫМ ЗА НУМАР

Купля будынка гасцініцы ў Гомельскай вобласці абышлася пакупніку танней, чым кошт аплаты стандартнага гасцінічнага нумара за суткі

Гэта насамрэч так. Камітэт «Гомельаблмаёмасць» 27 чэрвеня прадаў будынак гасцініцы ў Кармянскім раёне за адну базавую велічыню.

Будынак гасцініцы, які размешчаны ў аграгарадку Кароцькі, быў рэалізаваны адзінаму прэтэндэнту на куплю падчас чарговага аўкцыёну. Кошт продажу будынка агульнай плошчай больш за 300 квадратных метраў склаў усяго 25 рублёў 73 капейкі. Адзінае — трэба абавязкова выканаць умовы аўкцыёну. Для гэтага пакупнік павінен стварыць на аб'екце не менш двух працоўных месцаў і ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць на набытым будынку не менш за чатыры гады з моманту заключэння дагавора куплі-продажу. Гэта будзе зрабіць няцяжка. Нерухомасць новы ўладальнік плануе выкарыстоўваць па сваім прызначэнні.

Сяргей КУРКАЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 12 ліпеня 2018 года.**